БЕЛПОЧТА
Брестский филиал
ІМГНЕННАЯ ДАСТАЎКА ЗА МЕНШЫЯ ГРОШЫ
5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
4 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 104 (29473)
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ПАМЫЛКІ БЕЛАРУСАЎ У ХАРЧАВАННІ
19

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра:

«Зялёны» парадак дня ўваходзіць ва ўсе сферы эканомікі, становіцца важным трэндам. Аднаўляльныя рэсурсы, перапрацоўка адходаў, экалагічна чыстыя прадукты і экалагічная ўпакоўка, будаўніцтва ачышчальных збудаванняў, мінімізацыя выкідаў у атмасферу — усяму гэтаму ўдзяляецца ўвага, тут шырокае поле для дзейнасці. Мы думаем пра тое, што пакінем сваім дзецям і ўнукам, таму гэтая тэма ў прыярытэце».

ЭКАЛАГІЧНЫЯ РАШЭННІ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора ў Мінску адкрыўся XVI Рэспубліканскі экалагічны форум і І Міжнародная спецыялізаваная выстаўка Ecology Expo-2021. На працягу трох дзён удзельнікі мерапрыемстваў будуць знаёміцца з новымі «зялёнымі» тэхналогіямі, прыкладамі энергаэфектыўнага будаўніцтва, экалагічнага транспарту, спосабамі эфектыўнага выкарыстання адходаў, арганічнай і экалагічнай прадукцыі, экатурызму, найлепшых практык «зялёных» школ. Галоўная тэма рэспубліканскага экалагічнага форуму — «Далучэнне грамадскасці да прыняцця экалагічных рашэнняў».

Падчас цырымоніі адкрыцця форуму **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык** расказаў, што ўдзел у форуме бяруць дзяржаўныя органы, бізнес, прадпрыемствы, грамадскія арганізацыі, міжнародныя партнёры, моладзь, СМІ, грамадзяне, якія беражліва ставяцца да навакольнага асяроддзя, і падзякаваў кіраўніцтву краіны за стварэнне спрыяльных умоў для прыняцця экалагічных рашэнняў.

На выстаўцы значнае месца займае Мінпрыроды. Гэты стэнд, напрыклад, наглядна ілюструе перспектывы ўдасканальвання сістэмы абыходжання з адходамі.

Вераніка КОЛАСАВА.

КАРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў экс-кіраўніка Кубы Рауля Кастра Руса з 90-годдзем.**
- У свеце зроблена больш за 2 млрд прышчэпак ад каранавіруса.
- **МУС не выключае, што ў перспектыве выкарыстанне ID-карты стане магчымым і для выезду за мяжу.**
- «Белавія» арганізоўвае эвакуацыйныя рэйсы з Албаніі, Туніса і Чарнагорыі.

- **Беларусь прыняла захады ў адказ на санкцыі ЗША супраць канцэрна «Белнафтахім».**
- Больш за 1,5 тысячы фур сабралася ў чарзе на выезд з Беларусі ў ЕС.
- **Леанід Кучук пакінуў пасаду галоўнага трэнера мінскага «Дынама».**
- Расійская авіякампанія «Скол» запускае рэйсы з Калінінграда ў Мінск з 11 чэрвеня.

Інавацыі

ЗАЗІРНУЦЬ У БУДУЧЫНЮ

Што прадстаўлялі на TIBO сёлета

Міжнародны форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях TIBO праходзіць у Мінску 27-ы раз (у мінулым годзе мерапрыемства было адменена з-за COVID). Вы яшчэ можаце паспець «зазірнуць у будучыню» — форум пачаў работу ў «Мінск-Арэне» 1 чэрвеня, а завяршаецца сёння. Мы пабывалі на TIBO-2021. Расказваем, што запомнілася.

СТАР. 3

Вышэйшая школа

ПОСПЕХІ «СКАРЫНАЎЦАЎ»,

або Гомельскі дзяржуніверсітэт як нацыянальны ўніверсітэцкі брэнд

Гісторыя Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны бярэ свой пачатак у 1930 годзе з заснавання Гомельскага педагагічнага інстытута. Імя беларускага асветніка ВНУ носіць з 1988 года. Пра тое, як жыве сёння вялікая сям'я і дружная каманда ўніверсітэта, — інтэрв'ю з рэктарам ГДУ імя Ф. Скарыны Сяргеем ХАХОМАВЫМ:

— Сёння ва ўніверсітэце на 12 факультэтах рыхтуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты па 39 спецыяльнасцях. У цяперашні час навучанне праходзяць каля 9 тысяч чалавек. Таксама вядзецца падрыхтоўка магістрантаў па 20 спецыяльнасцях, у скарочаныя тэрміны — падрыхтоўка студэнтаў з ліку выпускнікоў каледжаў па 17 профільных спецыяльнасцях. Праз аспірантуру па 46 навуковых спецыяльнасцях рыхтуем спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, па 6 спецыяльнасцях — дактарантаў. Падрыхтоўка навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца ў тым ліку на англійскай мове.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
21104

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КАЛІ МЫ РАЗУМНА РАЗГОРНЕМСЯ, ТО НАМ ЯШЧЭ МАЛА БУДЗЕ ГЭТАЙ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам аб развіцці энергетычнага комплексу міністра энергетыкі Віктара Каранкевіча, намесніка прэм'ер-міністра Юрыя Назарава, памочніка Прэзідэнта Аляксандра Косінца. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі сённяшні стан энергасістэмы і яе перспектывы на будучыню.

У пачатку размовы Аляксандр Лукашэнка прывёў важныя факты. Так, па яго словах, магутнасць айчыннай энергетычнай сістэмы перавысіла 10 тысяч мегават. А даўжыня яе ліній — больш за 280 тысяч кіламетраў электрычных сетак і 7,5 тысячы кіламетраў цеплавых. Энергетычныя сістэма генерыруе каля 4 % валавога ўнутранага прадукту Беларусі.

«Гэта суперчыстая крыніца энергіі»

«Гаспадарка велізарная, асабліва з уводам новай для Беларусі крыніцы энергіі — Беларускай атамнай станцыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён пацікавіўся, як функцыянуе першы энергаблок станцыі, як прайшлі выпрабаванні электрастанцыі і наколькі яна гатовая для прамысловай эксплуатацыі. Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу на перспектывы выкарыстання атамнай энергіі, у тым ліку яе экспарту.

Ён параіў не перажываць, што не будзе куды дзець лішнюю энергію. ***«Калі мы разумна разгорнемся, то нам яшчэ мала будзе гэтай электраэнергіі. Гэта суперчыстая крыніца энергіі, яна патрэбная ўсюды і ва ўсім,*** пачынаючы ад жылля і прамысловасці да самой атамнай станцыі, якая таксама спажывае нямала электраэнергіі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнта цікавілі напрамкі, па якіх будзе весціся работа па павелічэнні спажывання электрычнай энергіі. ***«Калі на тое пайшло, трэба будзе — пабудуем другую атамную станцыю. У гэтым уся перспектыва.*** Нас увесь час крытыкаваў Захад, асабліва нашы суседзі: «ах, станцыя, бяспека і іншае», а самі запланавалі будаўніцтва станцый. Раней Літва выказвала гэта, цяпер яна ўжо задумалася аб будаўніцтве новай ці вярнуцца да Ігналінскай АЭС — але гэта іх праблемы. І Польшча плануе будаваць, а ўсе астатнія або будуюць, або ўжо пабудавалі», — сказаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў, што атамная энергія — гэта будучыня. «Дзякуй богу, мы ў свой час узяліся за гэтую праблему, здагадаліся, што трэба гэтым займацца. Гэта перспектыва. Гэта вышэйшыя тэхналогіі», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу на неабходнасць адпрацоўкі алгарытму дзеянняў па гэтым накірунку.

«Электрамабілі — перспектыва»

Другое важнае пытанне, на якое звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, — электрамабілі. «Сёння ўвесь свет паставіў жорсткія задачы па выхадзе на электрамабілі. Людзям надакучыла дыхаць брудам, людзі хочуць чысціні на планеце, у адваротным выпадку ў грязі гэтай патонем. Таму электрамабілі — перспектыва», — заўважыў ён.

Беларускі лідар адзначыў, што ў краіне павінна быць больш электразарадных станцый для машын на электрычным рухавіку. «Некаторыя людзі хочуць, каб каля дома была такая зарадная станцыя. ***Усё павінна быць разумна, мы не павінны на гэтым атрымліваць каласальны прыбытак. Мы потым на гэтым атрымаем прыбытак за кошт продажу электрычнай энергіі. Таму не ў страту, але станцыі трэба будаваць, пачынаючы ад парога тых, хто хоча, да грамадскага карыстання»,*** — сказаў кіраўнік краіны.

На пачатак 2021 года ў краіне налічвалася 420 станцый, на сённяшні момант іх ужо 450. Плануецца, што да канца 2021 года ў краіне будзе ўстаноўлена 600 электразарадных станцый. Прэзідэнт звярнуў увагу, што спыняцца на гэтым ні ў якім разе нельга.

«Калі мы прапануем станцыі ў маленькіх пасёлках, аграгарадках, можа быць, каля дома паставіць станцыю — мы павінны прапанаваць гэтыя паслугі. Насельніцтву ад кухні да электрамабіля трэба прапанаваць паслугі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, заўважыўшы, што «тады будзе спажыванне электраэнергіі».

«Не трэба спыняцца»

Акрамя галоўнай тэмы сустрэчы, намеснік прэм'ер-міністра Юрый Назараў закрануў іншыя пытанні, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю. Ён далажыў Прэзідэнту аб тым, што ў Добрушы прынялі ў эксплуатацыю кардонную фабрыку і яна ўжо выпускае кардон. На што кіраўнік дзяржавы адказаў, што хоча наведаць прадпрыемства і асабіста пазнаёміцца з вытворчасцю.

«Кардон — гэта прарыў. Нас таксама там сцябалі ў перадвыбарную кампанію: «Ах, на вуліцы пратэстуны, а Лукашэнка кардонам займаецца». Я ўсімі пытаннямі тады займаўся, а гэта быў вялікі інвестыцыйны праект», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што цяпер Беларусь можа сама выпускаць тавары з кардону, а не экспартаваць сыравіну і потым за мяжой купляць вырабы з яе. «Не трэба спыняцца: кардон атрымалі — далей станок трэба ставіць і рабіць упакоўку. Гэта вельмі важны кірунак», — заўважыў Прэзідэнт.

«Энергетыкі — малайцы, яны нас нідзе не падвялі»

У сваім дакладзе Прэзідэнту міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч далажыў, што энергасістэмай забяспечана стабільнае і ўстойлівае забеспячэнне спажыўцоў электрычнай і цеплавой энергіяй.

«Прычапіцца па дробязях можна, але па вялікім рахунку энергетыкі ў нас малайцы. Яны нідзе нас не падвялі. Я назіраў: калі зімой нешта ламаецца — яны, як салдаты, нават, можа, і лепш, адразу ліквідуюць аварыі. Малайцы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Віктар Каранкевіч дадаў, што на сістэмнай аснове мадэрнізуюцца асноўныя вытворчыя фонды, рэалізоўваюцца мерапрыемствы па інтэграцыі Беларускай атамнай электрастанцыі і павелічэнні электраспажывання ў краіне.

«У поўным аб'ёме завершана будаўніцтва катлоў на аб'ектах «Белэнерга», вызначаная магутнасць на канец 2020 года склала 916 мегават. Працягваюцца работы па будаўніцтве пікава-рэзервовых энергакрыніц на чатырох буйных электрастанцыях краіны. За студзень — красавік 2021 года аб'ём вытворчасці электрычнай энергіі склаў 14,4 млрд кілават-гадзін, рост да ўзроўню мінулага года — 109,4 %. Калі трэба, можам і больш», — заявіў міністр.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ Каментарый у тэму

Увосень плануецца загрузка свежага ядзернага паліва ў другі энергаблок

Пасля нарады з Прэзідэнтам **Віктар КАРАНКЕВІЧ** раскрыў журналістам падрабязнасці рабочай сустрэчы.

Ён расказаў, што на дадзены момант на першым энергаблоку Беларускай АЭС скончана доследна-прамысловая эксплуатацыя, праведзена комплекснае апрабаванне рэактарнай установкі на намінальнай магутнасці на працягу 15 сутак. І 29 мая быў падпісаны акт комплекснага апрабавання.

«З моманту ўключэння ў сетку першага энергаблока выпрацавана больш за 2,6 млрд кілават-гадзін электраэнергіі. Гэта дазволіла разлікова замясціць каля 670 млн куб. м прыроднага газу», — расказаў міністр. Па яго словах, для прыёмкі першага энергаблока ў эксплуатацыю ўрад стварыў адпаведную прыёмачную камісію, вызначаны парадак прыёмкі, выдадзена ліцэнзія на эксплуатацыю атамнай электрастанцыі.

Віктар Каранкевіч паведаміў журналістам пра работу над запускам другога энергаблока. Па яго словах, яго будаўнічая гатоўнасць складае 85 %, актыўна праводзяцца гідравыпрабаванні абсталявання і тэхналагічных сістэм першага і другога контураў.

«У красавіку гэтага года на пляцоўку БелАЭС пастаўлена свежае ядзернае паліва для другога энергаблока, якое прайшло ўваходны кантроль і знаходзіцца ў сховішчы. Увосень плануецца загрузка свежага ядзернага паліва ў другі энергаблок. Гэта будзе пачатак фізічнага пуску, і ў канцы 2021-га — пачатку 2022 года плануецца ўключэнне другога энергаблока ў сетку і выдача першых кілават-гадзін», — расказаў Віктар Каранкевіч.

У краіне расце спажыванне электраэнергіі

Міністр расказаў, што кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача па стварэнні ўмоў для павелічэння спажывання электраэнергіі ў краіне, у дадатак да тых, што ўжо рэалізоўваюцца на сістэмнай аснове. Адпаведна, у будучым неабходна мадэрнізаваць сеткавую інфраструктуру, каб стварыць умовы павелічэння электраспажывання ў краіне.

«За студзень — красавік гэтага года агульны аб'ём вытворчасці электраэнергіі ў краіне склаў 14,4 млрд кілават-гадзін, з якіх 13,9 млрд кілават-гадзін спажыта ў краіне. На экспарт пастаўлена 500 млн кілават-гадзін. Тэмп росту да ўзроўню мінулага года большы за 109 % дзякуючы павелічэнню спажывання электраэнергіі ў рэальным сектары, насельніцтвам, а таксама ў энергасістэме, уключаючы выкарыстанне электраэнергіі ў электракатлах для ацяплення буйных населеных пунктаў», — расказаў Віктар Каранкевіч.

Прагназуецца рост электраспажывання з 38 млрд кілават-гадзін у 2020 годзе да 44 млрд кілават-гадзін да 2025 года. «Гэта павелічэнне электраспажывання рэальным сектарам, насельніцтвам для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння, развіццё электратранспарту. Тут таксама ёсць станоўчыя лічбы: 120 % — рост электраспажывання электразараднымі станцыямі ў параўнанні з узроўнем мінулага года», — адзначыў міністр энергетыкі.

Ён звярнуў увагу на тое, што ў краіне ўжо створаны стымулы для росту спажывання электраэнергіі сярод насельніцтва. А менавіта, дзейнічаюць ільготныя тарыфы, кампенсуецца частка выдаткаў грамадзян, якія набываюць электраабсталяванне і рэканструюць электрасеткавую праводку дома.

«Гэта дало магутны стымул развіццю электраэнергіі для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жыллёвым фондзе. Рост спажывання сярод насельніцтва на гэтыя мэты за 4 месяцы — у 4 разы. Усяго аб'ём спажывання — 122 млн кілават-гадзін. Гэта не толькі рост у 4 разы ў параўнанні з узроўнем мінулага года, але гэта ўжо перавысіла гадавы аб'ём спажывання за 2020 год», — канстатаваў Віктар Каранкевіч.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мінспорту РФ падтрымае заяўку Казані на правядзенне летняй Алімпіяды

Міністэрства спорту Расіі гатова падтрымаць заяўку Казані на правядзенне летніх Алімпійскіх гульняў пасля заканчэння дзеяння санкцый, паведамляе РІА «Навіны».

Міністр спорту Татарстана Уладзімір Лявонаў у сераду паведаміў, што Казань можа разгледзець падачу заяўкі на правядзенне летніх Алімпійскіх гульняў пасля таго, як скончыцца дзеянне санкцый Спартыўнага арбітражнага суда (CAS) у 2022 годзе.

«Казань вядомая як спартыўная сталіца Расіі з пункту гледжання стандартаў спартыўнай інфраструктуры, па ўзроўні забяспечанасці персаналам, прафесійнай каманды, якая там працуе. Будзем спадзявацца, што яна будзе годна прынятая міжнароднай спартыўнай супольнасцю», — сказаў міністр спорту Расіі Алег Матыцын.

CAS 17 снежня 2020 года апублікаваў рашэнне па спрэчцы паміж Сусветным антыдопінгавым агенцтвам (WADA) і Расійскім антыдопінгавым агенцтвам (РУСАДА), згодна з якім Расіі на працягу двух гадоў забаронена праводзіць чэмпіянаты свету, Алімпійскія і Параалімпійскія гульні. Раней расійскіх чыноўнікаў і членаў Алімпійскага камітэта Расіі адхілілі ад Гульняў на два гады.

Лізавету II выкрылі ў расавай дыскрымінацыі на працягу дзесяцігоддзяў

Брытанскую каралеву Лізавету II выкрылі ва ўхіленні ад выканання законаў аб расавай дыскрымінацыі на працягу больш чым чатырох дзесяцігоддзяў. Пра гэта паведамляе газета The Guardian са спасылкай на дакументы, якія трапілі ў яе распараджэнне.

Як піша выданне, прадстаўнікі этнічных і расавых меншасцяў былі фактычна пазбаўлены права паскардзіцца на каралеўскі дом у выпадку адмовы ў прыёме на работу па расавай прыкмеце. Газета таксама высветліла, што ў 1968 годзе ў каралеўскім доме, па заўвагах яго супрацоўнікаў, наогул «адсутнічала практыка найму каляровых імігрантаў або замежнікаў» на канцылярскія пасады. Прадстаўнікам этнічных і расавых меншасцяў дазвалялася працаваць у якасці прыслугі.

Пры гэтым, адзначае выданне, у Букінгемскім палацы адмовіліся адказваць на пытанне аб тым, калі падобныя практыкі былі прыпынены.

Сакрэтная служба Даніі дапамагала ЗША шпіёніць за еўрапейскімі палітыкамі

Спецслужбы Даніі дапамагалі Злучаным Штатам шпіёніць за еўрапейскімі палітыкамі, уключаючы канцлера Германіі Ангелу Меркель, з 2012-га да 2014 года. Пра гэта паведамляе BBC са спасылкай на дацкія CMI.

Паводле паведамлення дацкай тэлекампаніі Danmarks Radio, Служба ваеннай разведкі (FE) супрацоўнічала з Агенцтвам нацыянальнай бяспекі ЗША (NSA) для збору інфармацыі. Паводле справаздачы, разведданыя былі сабраныя і пра іншых афіцыйных асоб з Германіі, Францыі, Швецыі і Нарвегіі.

Падобныя абвінавачанні былі агучаны і ў 2013 годзе, калі Эдвард Сноўдэн, былы супрацоўнік ЦРУ ЗША, апублікаваў інфармацыю аб праслухоўцы NSA тэлефона канцлера Германіі. Калі былі вылучаны гэтыя абвінавачанні, Белы дом не даў прамога абвяржэння, але сказаў, што тэлефон Меркель не праслухоўваецца ў той час і не будзе праслухоўвацца ў будучыні. Але, як стала вядома, праслухоўвалі не толькі канцлера Германіі, але і тады дзеючага міністра замежных спраў Франка-Вальтэра Штайнмаера і лідара апазіцыі Пеера Штайнбрука.

Ні Служба ваеннай разведкі, ні NSA пакуль не каментуюць апошнія паведамленні.

Весткі з Кітая

ДЗВЕ УХАНЬСКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

прыняты на форуме народнай дыпламатыі ШАС

Падчас форуму Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) ва Ухані на тэматычных пляцоўках панэльных сесій абмеркавалі пытанні развіцця аналітычных цэнтраў, агрэпрамысловага комплексу, гарадскіх агламерацый, аховы здароўя.

Як заўважыў у сваім прывітанні да ўдзельнікаў форуму **старшыня КНР Сі ЦЗІНЬПІН**, ШАС стала важнай пляцоўкай міжнароднага супрацоўніцтва. Гэтае ўзаемадзеянне даволі плённае — вынікам форуму ва Ухані стала падпісанне мультыфарматных дагавораў аб супрацоўніцтве, а таксама кантрактаў паміж суб'ектамі гаспадарання правінцыі Хубэй і знешнімі партнёрамі на суму звыш 13 мільярдаў юаняў ($2 млрд). Таксама была вылучана глабальная ініцыятыва экспертаў па стварэнні Пілотнай зоны аховы здароўя Кітай-ШАС ва Ухані. Меры, якія вызначаны ў ёй, надзвычай актуальныя ў кантэксце пандэміі каранавіруса. У прыватнасці, мяркуецца стварыць лабараторыю краін ШАС па тэсціраванні, маніторынгу і папярэджанні інфекцыйных захворванняў, рэгулярна праводзіць павышэнне кваліфікацыі медыцынскіх кадраў, а таксама ўдасканальваць меры экстраннага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі ў сферы аховы здароўя, павышаць патэнцыял прафілактыкі і кантролю.

У выніковай ініцыятыве форуму замацаваны намер пашыраць супрацоўніцтва па глыбокай інтэграцыі вытворчых ланцужкоў, кааперацыі ў галіне лічбавай эканомікі, электронай камерцыі, штучнага інтэлекту, «разумных» гарадоў. Як адзначыў **генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Уладзімір НОРАЎ,** на працягу 20 гадоў свайго існавання ШАС стала найбуйнейшай сусветнай рэгіянальнай платформай узаемадзеяння. Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін з агульным насельніцтвам звыш трох мільярдаў чалавек, якія фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. Чатыры дзяржавы (сярод іх Беларусь) маюць статус назіральнікаў, яшчэ шэсць з'яўляюцца партнёрамі па дыялогу.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ЗАЗІРНУЦЬ У БУДУЧЫНЮ

Разумныя вокны і разумныя парты

Нават калі па родзе заняткаў вы далёкія ад ІТ-сферы, новыя тэхналогіі мяняюць ваша жыццё і свет вакол вас. Напрыклад, ужо сёння нават дашкольная адукацыя і пачатковая школа, не кажучы пра старэйшую школу, навучанне ў каледжах і ВНУ, зусім не падобныя на тое, як вучыліся бацькі цяперашніх дзяцей і падлеткаў. Замест падручнікаў — планшэт, замест наведвання бібліятэкі — інтэрнэт. І, цалкам магчыма, вельмі хутка замест пісьмовых сталоў і парт у дашкалят і школьнікаў з'явіцца лічбавая «мэбля». Інтэрактыўнае дзіцячае абсталяванне прапанавалі ўвазе наведвальнікаў на TIBO-2021.

— Паверхня стала ўяўляе сабой інтэрактыўную панэль, унутры ўбудаваны камп'ютар, — расказвае **супрацоўніца кампаніі-распрацоўшчыка Валерыя ГОНЧАНКА.**

Стол разлічаны на дзіцячыя сады і малодшых школьнікаў, таму зроблены з павышанымі патрабаваннямі да бяспекі, а таксама да трываласці: на ім можна нават скакаць. На гэтым стале можна не толькі гуляць (напрыклад, падзяліць яго на патрэбную колькасць сегментаў і ладзіць спаборніцтвы паміж дзецьмі). Галоўнае, навінка дазваляе дзіцяці вучыцца. Напрыклад, адкрыць падручнік ці кнігу проста на паверхні стала або праводзіць тэсты па розных дысцыплінах. Праграмнае забеспячэнне прадугледжвае лагапедычны комплекс, трэніроўкі памяці і ўважлівасці, вывучэнне замежных моў і многае іншае.

Для старэйшых школьнікаў створана інтэрактыўная парта. Абсталяванне дазваляе трэніраваць навыкі вымаўлення на замежных мовах, арфаграфіі, матэматычныя дысцыпліны, таксама ёсць блок «Творчая майстэрня» і тэсты па ўсіх школьных прадметах. Праграмнае забеспячэнне такога абсталявання — гэта развіццёвыя і навучальныя комплексы, распрацаваныя спецыялістамі ў сваіх галінах.

Частка выставы была адведзена пад «Адукацыйную алею». Напрыклад, БДУ прадставіў на TIBO каля двух дзясяткаў распрацовак. У экспазіцыю вядучай ВНУ краіны ўвайшоў макет першага ўніверсітэцкага спадарожніка BSUSat-1, а таксама разумныя вокны — вадкакрысталічныя панэлі, якія ў залежнасці ад знешніх фактараў з празрыстых змяняюцца ў матавыя і наадварот. Цалкам магчыма, у будучыні разумныя вокны заменяць звычайныя шкляныя: інавацыя абараняе памяшканне ад шкоднага УФ-выпраменьвання і часткова блакіруе інфрачырвонае.

5G для вёскі і горада

Адной з галоўных тэм TIBO-2021 стала тэхналогія 5G. Яе прадстаўлялі не толькі мабільныя аператары і вытворцы гаджэтаў, але і «Белтэлекам».

— «Белтэлекам» мае тэхналагічныя перадумовы стаць мабільным аператарам, але старт гэтай мабільнай гісторыі хацелася б пачаць з найбольш прагрэсіўнай сучаснай тэхналогіі 5G, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях РУП «Белтэлекам» Сяргей ТУРОМША.** — Мы ўжо правялі тэсціраванне доследнай зоны 5G у дзвюх тэставых зонах — «Вялікім камені» і Капыльскім раёне. Спецыфіка «Белтэлекама» ў тым, што мы першыя ў Еўропе тэсціравалі гэтую мабільную тэхналогію ў нізкіх частотах (700 мегагерц). Мы прадэманстравалі, што 5G дазваляе ў сельскай мясцовасці, у малых населеных пунктах аказваць паслугі лічбавага тэлебачання, той жа інтэрнэт — там, дзе няма оптавалакна, як у горадзе. Наша галоўная ідэя — стаць аператарам 5G і стартаваць у гэтым сегменце.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярод карпаратыўных рашэнняў, якія могуць прымяняцца для бізнесу любога маштабу, «Белтэлекам» прадставіў дадатковы сэрвіс «Відэааналітыка» для паслугі «Відэакантроль». Новы модуль дазваляе ў рэжыме рэальнага часу аналізаваць даныя з усталяваных у карыстальніка камер відэаназірання. Таксама спецыялісты «Белтэлекама» дэманстравалі наведвальнікам рэсурсы сучаснага ТБ. У 2021 годзе кампанія мадэрнізавала і істотна пашырыла функцыянал тэлевізійнай платформы ZALA. Яшчэ адна навінка — фільмавыя пакеты паслуг «ЯСНА», створаныя ў супрацоўніцтве з вядомымі анлайн-кінатэатрамі ivi, MEGOGO і more.tv.

Яшчэ адной знакавай зонай экспазіцыі «Белтэлекам» стала ўніфікаваная сістэма кіравання, кантролю і ўліку інфармацыі інжынерных сістэм інтэлектуальных будынкаў — сучаснае рашэнне для ўліку спажывання камунальных рэсурсаў.

3D-маркі і «Паштоўкі дабра»

Стэнд РУП «Белпошта» таксама прадэманстраваў сучасныя паслугі і сэрвісы: магчымасці Нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы і лічбавай авансавай сістэмы разліку для юрыдычных асоб, пашыраны функцыянал прылады «Мабільны паштальён». А таксама выпускі марак, выкананых у 3D-рэальнасці: спампоўваеце праграму, і малюнкі ажываюць. Напрыклад, можна ўбачыць старажытныя паштовыя маршруты або (у выпуску, прысвечаным 1000-годдзю Брэста) ліхтаршчыка, што запальвае старадаўні ліхтар.

Зрэшты, чым больш сучасны свет паглыбляецца ў лічбавыя тэхналогіі, тым прыцягальней для многіх становяцца папяровыя лісты і паштоўкі. На стэндзе РУП «Белпошта» кожны ахвотны мог падпісаць на адрас родных і блізкіх маляўнічыя паштовыя карткі з бясплатнай дастаўкай па Беларусі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Блізкая ўлада

Летнія пытанні і адказы

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 5 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

ВОСЬ І 25 ЦЯПЛА

У пачатку наступнага тыдня і ўначы ўжо будзе 10—15 цяпла

Лета прыйшло і, як па графіку, цяпло прынесла. Бліжэй да нядзелі наогул стане цёпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У выхадныя дні фон атмасфернага ціску пачне падаць, і на тэрыторыю краіны будуць паступаць нявстойлівыя паветраныя масы з паўднёвых шырот. Надвор'е пачне мяняцца ўжо ў суботу. У гэты дзень неба будзе хмурыцца, стане больш аблокаў. Уначы яшчэ будзе пераважна без ападкаў, а ў дзённыя гадзіны ў асобных раёнах краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Аднак тэмпература паветра працягне паступова павышацца. Ужо ноччу будзе зусім не холадна — плюс 8—13 градусаў, а ўдзень стане наогул амаль горача — 20—25 градусаў цяпла.

Не будзе сонечнага надвор'я ў нядзелю. У гэты дзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 8—14 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 19—25 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ў краіне чакаецца няўстойлівае і цёплае надвор'е, калі ў начныя гадзіны месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагрымяць навальніцы.

Сяргей КУРКАЧ.

Анонс

Размова аднадумцаў

У Брэсце сёння, 4 чэрвеня 2021 года, адбудзецца зацікаўленая размова аднадумцаў, якія ў жывым фармаце і анлайн паразважаюць пра надзённыя пытанні духоўнага выхавання чытача на прасторах Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Выдавецкі дом «Звязда» і Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі праводзяць міжнародны круглы стол «Радзімазнаўчы аспект у творчасці пісьменнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў».

— Мы запрасілі да размовы, — гаворыць **дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Алена СТРЫЖЭВІЧ,** — не толькі нашых калег — бібліятэкараў з розных куточкаў Беларусі, але і пісьменнікаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Рады, што да ўдзелу ў міжнародным круглым стале спрычыняцца намеснік старшыні секцыі рускай літаратуры Саюза пісьменнікаў Узбекістана Галіна ДОЛГАЯ, галоўны спецыяліст аддзела міжнародных сувязяў і мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў Узбекістана, празаік, перакладчык, публіцыст Рысалат ХАЙДАРАВА, літаратуразнавец, загадчык аддзела аналітыкі і знешніх літаратурных сувязяў Інсытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава, кандыдат філалагічных навук Святлана АНАНЬЕВА, сябра Саюза пісьменнікаў Узбекістана, празаік і публіцыст Кучкар НАРКАБІЛ, доктар філалагічных навук з Азербайджана Флора НАДЖЫ, вядомы расійскі гістарычны раманіст, які нарадзіўся ў Беларусі, Мікалай ЧАРКАШЫН, ды і шмат хто яшчэ.

Падзея адбываецца ў Брэсце невыпадкова. Абласная бібліятэка з'яўляецца сапраўдным эпіцэнтрам краязнаўчай работы ў рэгіёне. Традыцыйна тут уважлівыя і да краязнаўчай бібліяграфіі. Будзем спадзявацца, што на міжнародным круглым стале прагучыць нямала адметных, цікавых высноў.

Сяргей ШЫЧКО.

ПОСПЕХІ «СКАРЫНАЎЦАЎ»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— ГДУ імя Ф. Скарыны — гэта ў тым ліку аўтарытэтны навукова-даследчы цэнтр. Якія дасягненні ў навукоўцаў універсітэта?

— У складзе ўніверсітэта — два навукова-даследчыя інстытуты: фізіка-хімічны, гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў. На базе чатырох навукова-даследчых лабараторый функцыянуе Цэнтр калектыўнага карыстання па экалагічным маніторынгу і даследаванні складу і ўласцівасцяў рэчываў. Ён забяспечаны ўнікальным навуковым абсталяваннем. Ва ўніверсітэце працуе 68 навукова-даследчых лабараторый, з якіх 48 — студэнцкія. Дзейнічаюць тры міжнародныя навукова-даследчыя лабараторыі, створаны тры спецыялізаваныя саветы па абароне дысертацый па чатырох спецыяльнасцях.

У супрацоўніцтве з Шанхайскім прафесійным інстытутам індустрыі, камерцыі і замежных моў на базе ГДУ імя Ф. Скарыны адкрыты Цэнтр навучання кітайскай мове. Філіял Гомельскага дзяржуніверсітэта працуе ў Шанхаі. У Гомелі на базе цэнтра вядзецца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «Руская філалогія»: два з паловай гады кітайскія студэнты навучаюцца ў Шанхаі, затым два наступныя гады праходзяць падрыхтоўку ў Гомелі, дзе атрымліваюць дыплом бакалаўра.

«Бюджэтны набор па-ранейшаму пераважае, што адпавядае сацыяльна арыентаванай палітыцы нашай краіны».

Навукоўцы ўніверсітэта вядуць даследаванні па праекце TransFerr у межах праграмы Еўрапейскага саюза па навуцы і інавацыях «Гарызонт 2020». Рэалізоўваюцца два праекты Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы па зольгель тэхналогіях і сумесна з Веткаўскім музеем па старавераўскіх абразах. ГДУ ў межах дагавора аб супрацоўніцтве ажыццяўляе сумесную падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з універсітэтам Шызуока (Японія). Такога роду супрацоўніцтва дазваляе найлепшым выпускнікам факультэта фізікі і IT прайсці навучанне ў аспірантуры ўніверсітэта Шызуока і атрымаць ступень PhD за мяжой.

— Ці атрымліваецца прымяніць на практыцы распрацоўкі навукоўцаў універсітэта?

— Мы імкнёмся да гэтага. Адзін з прыкладаў: на факультэце фізікі і інфармацыйных тэхналогій сіламі маладых супрацоўнікаў, у тым ліку студэнтаў і валанцёраў, была выпрацавана тэхналогія і асвоены выраб медыцынскіх ахоўных экранаў для медыцынскіх устаноў горада Гомеля і Гомельскай вобласці. Было задзейнічана ўсё неабходнае абсталяванне: ад 3D-прынтараў да лазерных установак. Старшыня Гомельскага аблвыканкама адзначыў высокую якасць ахоўных асабістых экранаў, падкрэсліў важнасць гэтай ініцыятывы і выказаў калектыву ўніверсітэта асаблівую падзяку за годную грамадзянскую пазіцыю. У сваю чаргу навукоўцы Навукова-даследчага фізіка-хімічнага інстытута ГДУ імя Ф. Скарыны распрацавалі і выкарысталі ва ўласнай дзейнасці метад нанясення пакрыццяў з высокімі антыбактэрыяльнымі і антыфунгальнымі пралангіраванымі ўласцівасцямі. Распрацоўка прызначана для папярэджання з'яўлення бактэрыяльных, грыбковых і змешаных біяплёнак на паверхнях вырабаў медыцынскага прызначэння, якія ўводзяцца ў арганізм чалавека. Штогод па дагаворах з ТАА «Медбіятэх» універсітэт аказвае паслугі па нанясенні кампазіцыйных пакрыццяў на імплантаты, што знікае рызыкі ўзнікнення пасляаперацыйных ускладненняў.

Студэнты ГДУ імя Ф. Скарыны.

— Раскажыце пра развіццё міжнародных кантактаў ВНУ ў адукацыйнай і навуковай сферах.

— Штогод універсітэт наведваюць дзясяткі замежных дэлегацый. Заключаны шэраг дагавораў аб супрацоўніцтве з навучальнымі ўстановамі, навуковымі і адукацыйнымі цэнтрамі КНР, Казахстана, Польшчы, Расіі, В'етнама, Партугаліі, Узбекістана, Украіны. Сумесна з Маскоўскім дзяржаўным абласным універсітэтам, Варонежскім дзяржаўным лесатэхнічным універсітэтам імя Р. Ф. Марозава, Міжнародным універсітэтам SILKWAY ГДУ імя Ф. Скарыны рэалізоўвае праграмы ўключанага навучання. Паспяхова функцыянуюць сумесныя магістратуры з Маскоўскім інстытутам электроннай тэхнікі і з Курскай акадэміяй дзяржаўнай і муніцыпальнай службы. Аспіранты ГДУ абараняюць дысертацыі ў Японіі, Фінляндыі, Швецыі, Германіі, Італіі. Становяцца ўладальнікамі навуковых ступеняў і дыпломаў міжнароднага ўзору. У ГДУ дзейнічаюць 177 дагавораў аб супрацоўніцтве з замежнымі ўніверсітэтамі і арганізацыямі больш чым з 25 краін свету.

— Якім чынам ажыццяўляецца інтэграцыя ўніверсітэта ў сусветны вучэбны і навукова-даследчы працэс?

— Мы актыўна развіваем міжнародную акадэмічную мабільнасць навучэнцаў. У рамках праграмы ERASMUS+ інструмента «Крэдытная мабільнасць» ГДУ імя Ф. Скарыны мае міжінстытуцыянальныя пагадненні з шасцю еўрапейскімі ВНУ. Акрамя таго, нашы студэнты рэгулярна выязджаюць на стажыроўкі ў Германію па праграмах Германскай службы акадэмічных абменаў. Штогод студэнты ў індывідуальным парадку або групамі выязджаюць на стажыроўкі ў вядучыя ўніверсітэты розных краін свету. Удзел у праграмах міжнародных летніх школ таксама з'яўляецца інструментам для развіцця акадэмічнай мабільнасці. У ліпені 2021 года студэнты нашага ўніверсітэта маюць магчымасць прыняць удзел у праекце «Летні ўніверсітэт 2021»: 12 універсітэтаў з сямі федэральных акругоў Расіі адкрываюць свае дзверы для беларускіх студэнтаў і прапануюць засваенне дадатковых адукацыйных праграм па розных напрамках.

Між тым наш універсітэт быў першым у Беларусі, які яшчэ ў 1999 годзе выкарыстаў сістэму дыстанцыйнага навучання школьнікаў і студэнтаў праграмаванню. За гэтыя гады на партале, што мае таксама англамоўную версію, зарэгістравана больш чым 70 тысяч карыстальнікаў з 90 краін свету. З 2018 года пачалася падрыхтоўка спецыялістаў I ступені вышэйшай адукацыі па дыстанцыйнай форме.

— Вядома, што Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны — адзін з лідараў па навучанні замежных студэнтаў.

— Так, на вучобу да нас прыязджаюць студэнты з 16 краін свету: Туркменістана, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана, Турцыі, Ірака, КНР, Ізраіля, Расіі, В'етнама, Нігерыі і іншых краін. Арганізоўваюцца розныя этнаграфічныя святы, выставы і фестывалі страў нацыянальнай кухні, што стварае ўнікальнае мультыкультурнае асяроддзе, дзе пануе атмасфера павагі да розных нацыянальнасцяў, падтрымліваецца культурны дыялог. Універсітэт рэгулярна наведваюць замежныя вучоныя з сусветным імем, якія праводзяць навучальныя курсы, трэнінгі і майстар-класы на замежных мовах.

— Раскажыце аб міжнародным рэйтынгу ГДУ імя Ф. Скарыны.

— Універсітэт уваходзіць у спісы глабальных і рэгіянальных рэйтынгаў універсітэтаў, такіх як Ranking Web of repositories; Academic Ranking of World Universities-Europeans Standard ARES; рэйтынг ВНУ краін СНД RAEX Эксперт РА. Цяпер у сусветным рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics ГДУ імя Ф. Скарыны займае чацвёртую пазіцыю сярод найлепшых ВНУ Беларусі і ўваходзіць у 12 % найлепшых устаноў адукацыі свету. Усяго ў рэйтынгу Webometrics улічана больш чым 28 тысяч навучальных устаноў.

«ГДУ ў межах дагавора аб супрацоўніцтве ажыццяўляе сумесную падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з універсітэтам Шызуока (Японія)».

— Што можна адзначыць пра выпуск-2021 ГДУ імя Ф. Скарыны і ўступную кампанію 2021 года ў ГДУ?

— У цэлым у гэтым годзе ўніверсітэт выпусціў 1451 спецыяліста I ступені (874 чалавекі з вочнай формы навучання, завочнай — 577). Размеркаваць належала 514 выпускнікоў. Усе яны атрымалі першае працоўнае месца на прадпрыемствах і арганізацыях. Звыш 80 выпускнікоў, якія праходзілі навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, адпаведна, былі накіраваны па месцы замацавання. Сем выпускнікоў платнай формы навучання выказаліся за размеркаванне і таксама атрымалі накіраванне на работу. У сваю чаргу ў гэтым годзе 197 чалавек — выпускнікі II ступені навучання, накіраваны на работу 56 магістрантаў.

Што датычыцца ўступнай кампаніі бягучага года, трэба адзначыць актыўную работу Міністэрства адукацыі па павелічэнні колькасці мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў. Больш увагі будзе ўдзяляцца падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай скарочанай форме для абітурыентаў, якія ўжо маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю. Мы задаволены тым, што ўніверсітэту, па нашым хадатайніцтве, з улікам адкрыцця новых спецыяльнасцяў, Міністэрства адукацыі выдзеліла дадаткова 22 бюджэтныя месцы (18 — на дзённую форму навучання і 4 — на завочную). Такім чынам, абітурыентаў у ГДУ чакаюць 1423 месцы, у тым ліку 747 бюджэтных і 676 платных. Бюджэтны набор па-ранейшаму пераважае, што адпавядае сацыяльна арыентаванай палітыцы нашай краіны.

Падчас заняткаў у лабараторыі робататэхнікі.

— Вядома, што ўніверсітэт аператыўна рэагуе на змены ў патрэбах рынку працы. Раскажыце, якія новыя спецыяльнасці адкрыты ў ГДУ апошнім часам?

— Ва ўступную кампанію—2020 быў адкрыты набор на новых спецыяльнасцях на трох факультэтах. Так, на факультэце матэматыкі і тэхналогій праграмавання быў першы набор на «Прыкладную інфарматыку (праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)» са спецыялізацыяй «Мультымедыйныя сістэмы і інтэрнэт-праграмаванне». У перспектыве выпускнікі — гэта праекціроўшчыкі інфармацыйных сістэм, менеджары праграмных праектаў, спецыялісты па тэсціраванні праграмных прадуктаў, выкладчыкі ў сферы інфармацыйных тэхналогій. На гістарычным факультэце ўпершыню прайшоў набор студэнтаў на спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)» — далейшая работа выпускнікоў магчыма ў турыстычным бізнесе. Прысвойваецца кваліфікацыя «Спецыяліст па міжкультурных камунікацыях. Перакладчык-рэферэнт (англійская і нямецкая мовы)». Важна, што нашы выпускнікі змогуць весці дыялог з партнёрамі на адной мове, гэта дазволіць прасоўваць інтарэсы айчыннага бізнесу на замежным рынку пры дапамозе добра наладжаных дзелавых перагавораў. На філалагічным факультэце была адкрыта новая спецыяльнасць «Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)».

«Навукоўцы ГДУ распрацавалі метад нанясення пакрыццяў з высокімі антыбактэрыяльнымі і антыфунгальнымі пралангіраванымі ўласцівасцямі».

Ва ўступную кампанію сёлета зноў будзе адкрыты набор па трох новых спецыяльнасцях. Дзве з іх на філалагічным факультэце. Гэта «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» і «Руская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская). На факультэце фізікі і інфармацыйных тэхналогій новая спецыяльнасць «Камп'ютарная бяспека». Трэба адзначыць, што нашы прадпрыемствы ўсё часцей сутыкаюцца з патрэбай у спецыялістах, якія ведаюць прынцыпы распрацоўкі і прымянення праграмна-апаратных, крыптаграфічных і тэхнічных сродкаў аховы інфармацыйных і камп'ютарных сістэм. Таму адкрыццё новай спецыяльнасці па камп'ютарнай бяспецы з'яўляецца вельмі актуальным.

— Сяргей Анатолевіч, сёння ГДУ імя Ф. Скарыны — гэта яшчэ і адкрытая пляцоўка для абмеркавання пытанняў, што хвалююць студэнтаў і выкладчыкаў Гомельшчыны.

— Так, лічу, што ў рабоце кіраўніка ўніверсітэта вельмі важна стварыць камфортныя ўмовы для адкрытага дыялогу са студэнтамі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі. Варта абмяркоўваць усе актуальныя пытанні як лакальнага ўзроўню — вучоба, жыццё ў інтэрнаце і гэтак далей, — так і ўзроўню рэгіёна, краіны. Менавіта таму ўжо традыцыйнымі ў ГДУ сталі адкрытыя дыялогі з супрацоўнікамі рэктарата, прадстаўнікамі выканаўчай і заканадаўчай улады, актывістамі грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый. Падчас работы дыялогавых пляцовак у ГДУ былі агучаны прапановы па ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю, абраны дэлегаты на VI Усебеларускі народны сход. У гэтым навучальным годзе для студэнтаў і выкладчыкаў былі арганізаваны дзясяткі сустрэч з прадстаўнікамі міністэрстваў, дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, членамі Савета Рэспублікі. Вядома, работа ў гэтым кірунку працягнецца.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

БЕЛПОЧТА Брестский филиал

ТЭРМІНОВА, БЯСПЕЧНА, ЗА МЕНШЫЯ ГРОШЫ

Новыя паслугі з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій карыстаюцца попытам у кліентаў як у абласным цэнтры, так і ў рэгіёнах Брэстчыны

Што мы з вамі прывыклі рабіць, калі тэрмінова і неадкладна трэба транспартаваць з аднаго горада ў іншы важны дакумент? Звычайна ідзём на пошту і накіроўваем яго заказным пісьмом. Тады наш адрасат гарантавана атрымае пасланне. А калі чакаць некалькі дзён не выпадала, то, скажам, раней нашаму чалавеку заставалася хіба сядаць у цягнік і везці дакумент самому. Гэта цяпер мы сталі карыстацца паслугай паскоранай пошты, калі адпраўленне могуць даставіць сёння на заўтра.

Імгненная дастаўка

А калі і сутак у запасе няма?

— Цяпер стала цалкам магчымай імгненная дастаўка любога дакумента з поўнай гарантыяй аховы інфармацыі і яе канфідэнцыяльнасці, — расказвае **начальнік камерцыйнага аддзела Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Кацярына КОЗЕЛ.** — Зусім нядаўна ва ўжытак увайшоў абмен электроннымі паштовымі адпраўленнямі, які стаў магчымы пасля ўкаранення РУП «Белпошта» Нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы. Яна цікавая для кліентаў, якія адпраўляюць і простыя, і заказныя пісьмы.

Перасылка мае два фарматы. У першым выпадку абодва суб'екты — і адпраўшчык, і атрымальнік — зарэгістраваны ў Нацыянальнай паштовай сістэме, тады і становіцца магчымай імгненная дастаўка пісьма. Другі фармат прадугледжвае адпраўшчыка, які з'яўляецца карыстальнікам Нацыянальнай паштовай сістэмы. У гэтым выпадку сістэма вельмі хутка распазнае, што атрымальніка ў ёй няма, тады яна раздрукуе пасланне, запакуе ў канверт, а пошта ўжо даставіць яго ў любы населены пункт краіны.

Выгада тут відавочная. Дастаткова прайсці рэгістрацыю на інтэрнэт-партале «Белпошты», завесці персанальны электронны кабінет і можна ў любы зручны час сутак адпраўляць пісьмы адрасатам. Калі гаворка ідзе аб простых пісьмах, то апісанай працэдуры дастаткова, можна прымацоўваць пісьмы накшталт перапіскі па электроннай пошце і адпраўляць. Калі адпраўленне заказное, прадугледжаны парадак аплаты праз інтэрнэт. Ну і, вядома, у выпадку заказнога пісьма паведамленне аб дастаўцы будзе абавязкова накіравана адпраўшчыку.

Безумоўная перавага такой перасылкі — вельмі хуткая дастаўка. Сістэма гарантуе бяспеку і канфідэнцыйнасць перапіскі. Пісьмы ідуць па абароненых каналах перадачы даных з выкарыстаннем сертыфікаваных сродкаў крыптаграфічнай аховы інфармацыі. Адпадае неабходнасць траціць паперу, купляць канверты, маркі, гэта значыць, маем відавочную эканомію затрат. Акрамя таго, з'яўляецца магчымасць аператыўна атрымліваць паведамленні аб паступленні паштовых адпраўленняў, аб іх дастаўцы, аб прачытанні. Такая інфармацыя паступае на электронную пошту кліента альбо на тэлефон у выглядзе СМС-паведамленняў. Гэта несумненная зручнасць.

Сапраўды, яшчэ вельмі шмат неабходных і важных для работы дакументаў перасылаецца ў канвертах. Цяпер многія працуюць дыстанцыйна. А вось, напрыклад, уласны карэспандэнт газеты так працаваў заўсёды. Камандзіровачныя пасведчанні, авансавыя справаздачы даводзіцца перасылаць туды-сюды пастаянна, гэта стварае немалы дакументазварот. Варта, відаць, ставіць пытанне аб пераводзе яго ў электроннае поле. Кацярына Аляксееўна лічыць, што гэта пытанне часу. Калі ўстановы і арганізацыі прымуць у сябе пастановы, якімі прадугледзяць, што скананая копія, напрыклад, камандзіровачнага пасведчання мае юрыдычную сілу, то працэс стане намнога больш хуткі і эканамічны.

— Цяпер ідзе актыўная работа па напаўняльнасці базы. Чым больш з'явіцца кліентаў у Нацыянальнай паштовай сістэме, тым больш аператыўна і дакладна будуць дастаўляць паведамленні, — разважае начальнік аддзела.

Паштамат 24/7

Лічбавыя тэхналогіі адкрываюць неабмежаваныя магчымасці для пошты. Напрыклад, нядаўна ў Брэсце з'явіўся першы паштамат. Гэта зручны спосаб атрымання міжнародных паштовых адпраўленняў. Яго перавага відавочная: не трэба ісці ў паштовае аддзяленне, займаць чаргу — паштамат працуе ў рэжыме 24/7. Для атрымання адпраўленняў трэба зарэгістравацца ў асабістым кабінеце і прайсці ідэнтыфікацыю ў аддзяленні паштовай сувязі з прад'яўленнем дакумента, рэквізіты якога былі выкарыстаны пры рэгістрацыі.

Каля паштамата ў Брэсце.

Першы паштамат у абласным цэнтры ўстаноўлены па Варшаўскай шашы, 11. Вось што сказала кліент новай паслугі Святлана Ромах:

— Мяне зацікавіў паштамат, як толькі ён паявіўся. Па-першае, я жыву побач, па-другое, карыстаюся інтэрнэт-магазінамі. І калі атрымала запрашэнне ад пошты скарыстацца гэтым сэрвісам, адразу ж зарэгістравалася і перанакіравала свой заказ, які афармліла ў той жа дзень, на паштамат. Апошні вельмі просты ў карыстанні, інструкцыя знаходзіцца побач. Каб забраць пасылку, спатрэбілася ўвесці код, які быў высланы на тэлефон. Калі ўвяла код, адчынілася ячэйка, і я забрала сваё адпраўленне. Уся аперацыя здзейснілася менш за мінуту.

Застаецца дадаць, што адпраўленне трэба перанакіраваць да моманту яго паступлення на мытны кантроль. Захоўваецца яно ў паштамаце тры дні з моманту дастаўкі. Калі кліент па нейкіх прычынах не змог забраць яго за гэты час, пасылка будзе перанакіравана ў аддзяленне паштовай сувязі, якое вас абслугоўвае. Паслуга запатрабавана. У хуткім часе паштаматы будуць устаноўлены таксама ў Баранавічах, Пінску, яшчэ адзін з'явіцца ў Брэсце.

СМС-код для атрымання

Кацярына Козел расказала пра шэраг цікавых паслуг, якія сталі магчымыя літаральна ў апошнія месяцы. Напрыклад, атрыманне паштовых адпраўленняў з дапамогай СМС-сувязі. Для гэтага патрэбныя заява і рэгістрацыя. І тады не варта будзе насіць дакументы з сабой, запаўняць бланкі. Дастаткова назваць прозвішча і нумар паведамлення. Пасля гэтага на тэлефон паступіць СМС-код. Яго кліент паведамляе аператару і забірае сваю пасылку. Гэтую форму вельмі актыўна скарыстоўвае моладзь. Адным словам, паштовая сувязь развіваецца ў кірунку выкарыстання найноўшых лічбавых тэхналогій на карысць і для зручнасці кліентаў. Гэта датычыцца і паскоранай пошты EMS, якая дазваляе забяспечыць перасылку і дастаўку дакументаў і тавараў па тэрыторыі нашай краіны.

Але разам з тым Кацярына Аляксееўна настойліва заклікае не забывацца пра звычайнае пісьмо і паштоўку, асабліва на святы, каб родныя і знаёмыя адчулі вашу любоў і прыязнасць. Нішто не заменіць слова, якое ідзе ад душы і напісана ад рукі. Чым больш будуць укараняцца электронныя стасункі, тым большую каштоўнасць набывае напісанае ўласнаручна і адрасаванае канкрэтнаму чалавеку.

КАЛІ ЛАСКА, У ПОШТА-МАРКЕТ

У Кобрынскім раёне адкрыўся аб'ект у фармаце самаабслугоўвання

У невялікіх населеных пунктах, дзе не вельмі шырока прадстаўлены гандлёвыя сеткі, на пошце адкрываюцца сапраўдныя міні-супермаркеты. Пакупнік можа купіць там самыя розныя прадукты харчавання, гаспадарчыя рэчы, прамысловыя тавары.

Маецца неблагі асартымент галантарэі і парфумерыі. Адным словам, усе тавары першай неабходнасці можна набыць тут, калі зайшоў на пошту аплаціць паслугі, атрымаць пасылку альбо падпісацца на любімае выданне.

Начальнік аддзялення паштовай сувязі Корчыцы Святлана ЧАРАПКО з пакупніцай у гандлёвай зале.

Нядаўна такі аб'ект адкрылі ў вёсцы Корчыцы Кобрынскага раёна. Жыхарка вёскі настаўніца Ірына Назарук сказала: «Гэта вельмі зручна для жыхароў. У населеным пункце, дзе пражывае прыкладна 200 чалавек, ёсць толькі адна крама райспажыўкааперацыі. А цяпер, выходзіць, з'явіўся канкурэнт, што заўсёды ідзе на карысць цэнавай палітыцы. Тым больш што паштавікі і раней прапаноўвалі дэмакратычныя цэны на свой асартымент. А цяпер яшчэ і асартымент тавараў стаў у разы большы».

Для бяспекі і захавання тавараў устаноўлена сістэма відэаназірання, экран якой знаходзіцца на рабочым стале начальніка аддзялення сувязі.

Гандлёвая зала пошты выдатна ўмясціла абсталяванне стандартных памераў са стэлажамі, глыбокімі паліцамі, халадзільнікам. Халадзільнае абсталяванне спатрэбілася для рэалізацыі прадуктаў глыбокай замарозкі (тут можна набыць курыцу, мясныя субпрадукты). У аддзяленні сувязі арганізаваны гандаль пад заказ. Пакупнікі маюць магчымасць пакінуць папярэднія заяўкі на набыццё тавараў для саду і агарода, буйнагабарытнай тэхнікі, бытавой тэхнікі, веласіпеда. Усё гэта будзе дастаўлена ў сцісłыя тэрміны, а чалавеку не спатрэбіцца ехаць у райцэнтр, шукаць транспарт для дастаўкі. Гэта асабліва важна для пенсіянераў, адзінокіх людзей.

Тавары на паліцах пошта-маркета.

Вельмі зручна, што насупраць вітрыны з таварамі размешчаны інфармацыйны стэнд з рэкламай паштовай прадукцыі і паслуг, а таксама куток кліента. Такім чынам, вясковыя жыхары, якія прыходзяць на пошту, могуць паспяхова правесці ўсе неабходныя паштовыя аперацыі, аплаціць паслугі, а заадно зрабіць неабходныя пакупкі. Корчыцкі пошта-маркет стаў 14-м па ліку ў вобласці.

Матэрыялы старонкі падрыхтавала Святлана ЯСКЕВІЧ.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества государственного предприятия «Белэнергострой» – управляющая компания холдинга» (Продавец)

Лот № 310521001: думпкарная вертушка составом 20 вагонов (модель 31-675). **Местонахождение:** Минская область, Пуховичский р-н, п. Дружный, промплощадка ТЭЦ-5. **Начальная цена с НДС –** 1 359 494,00 руб. **Электронные торги состоятся 18.06.2021, 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).** Извещение о проведении электронных торгов, в том числе детальная информация о порядке участия в электронных торгах, условиях участия, сроке подписания договора купли-продажи, условиях оплаты, размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by), Организатора электронных торгов (http://torgi.бел, http://ino.by).

☎ Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества

Предметы торгов	Начальная цена продажи, руб. (без учета НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-10491 (наименование: изолированное помещение № 3; назначение: административное помещение), площадью 624,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Наганова, 10	512 000,00	51 200,00
Лот № 2: изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-10492 (наименование: изолированное помещение № 4; назначение: административное помещение), площадью 688,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Наганова, 10-4	482 000,00	48 200,00

Продавец: Брестский ОК ОО «БРСМ», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона. **Обременение:** наличие действующих договоров аренды.

Аукцион состоится 06 июля 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно уточнить по телефонам 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 05 июля 2021 г. до 17.00

Извещение о проведении 18 июня 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Весовая проходная общей площадью 62,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21229 (составные части и принадлежности: одноэтажное панельное здание весовой проходной с технологической асфальтобетонной площадкой а, пешеходной дорожкой а1); административно-производственный корпус общей площадью 346,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21228 (составные части и принадлежности: одноэтажное бетонное здание административно-производственного корпуса с двумя пристройками Б1/к, В1/к); здание мехмастерских общей площадью 347,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21226 (составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание мехмастерских с пристройкой Б1/к); бытовой корпус общей площадью 187,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21227 (одноэтажное кирпичное здание бытового корпуса); туалет кирпичный общей площадью 4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21225 (одноэтажное здание кирпичного туалета); водопроводная сеть с инв. № в ЕГРНИ 601/С-21231 (составные части и принадлежности: водопроводная сеть В, артезианская скважина В1, водопровод В2); электросеть с инв. № 601/С-21234 (составные части и принадлежности: электросеть, состоящая из девяти участков сети 1.1, 1.2, 1.3, 1.4, 1.5, 1.6, 1.7, 1.8, 1.9, комплектной трансформаторной подстанции 1.10 с опорой линии электропередачи 1.10.1); трансформатор силовой, инв. № 706-1
Сведения о земельном участке: площадь – 1,1412 га, кадастровый номер – 623200000028000002
Местонахождение: Республика Беларусь, Минская обл., Логойский р-н, район, г. п. Плещеницы
Начальная цена: 14 950,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 1 400,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемыми имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 18 июня 2021 года в 12.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 04.06.2021 по 16.06.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об аукционе

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-9547 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 146,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36 с пожарной сигнализацией ППК А6-06. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424950100001002033 площадью 0,0408 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина)), расположенном по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0408 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0002 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5.5, площадью 0,0015 га
Начальная цена продажи 122 700,00 руб. (сто двадцать две тысячи семьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 12 270 руб. (двенадцать тысяч двести семьдесят рублей)
Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 05 июля 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 01 июля 2021 г. до 15.00
Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, тел./факс (8017) 361 67 99; (8017) 399 53 94; (8017) 370 84 18, (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда с 8.45 до 13.00; вторник, четверг с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 15 по ул. Юрия Семеняко;
2. Жилой дом № 6 по ул. Маршала Лосика;
3. Жилой дом № 14 по ул. Маршала Лосика;
4. Жилой дом № 4 по ул. Малакович;
5. Жилой дом № 16 по ул. Маршала Лосика;
6. Жилой дом № 23 по ул. Юрия Семеняко;
7. Жилой дом № 21 по ул. Юрия Семеняко.

Застройщиком получены:

- свидетельство (удостоверение) № 500/869-15470 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000006010259;
- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 01.12.2020;
- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 22.03.2021 № 76-15/21;
- решение Мингорисполкома от 14.05.2021 № 1473 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 27.05.2021 № 2-208Ж-023/21;
- договор строительного подряда от 24.05.2021 № 24-05/2021 с ОАО «МАПИД».

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 4 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4 (5-я очередь строительства)».

Жилой дом № 4 по генплану запроектирован на основе проектных решений жилых домов типовой серии М111-90, односекционным, 19-этажным, на 130 квартир, с техподпольем, встроенным на 1-м этаже помещением товарищества собственников, теплым техническим чердаком. В здании запроектирована незадымляемая лестничная клетка и два лифта.

Внутренняя отделка:

стены – оклейка обоями под покраску (жилые комнаты, коридоры квартир, кладовая, кухни), окраска водно-дисперсионная (ванные, санузлы, уборные);

потолки – окраска водно-дисперсионная (жилые комнаты, кухни, санузлы, коридоры квартир, уборные, ванные);

полы – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове (жилые комнаты, коридоры, кладовые квартир, кухни); керамическая плитка (санузлы, уборные, ванные);

окна – профиль ПВХ, оснащены детскими замками безопасности;

двери – деревянные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства 86 квартир для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (по направлениям администраций районов г. Минска):

- 11 (одиннадцать) однокомнатных квартир;
- 57 (пятьдесят семь) двухкомнатных квартир;
- 18 (восемнадцать) трехкомнатных квартир.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 4 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1 583,96 бел. рублей; для площади, превышающей нормативную – 2 050,00 бел. рублей.

Начало строительства – 26 мая 2021 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 26 августа 2022 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 102.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента получения договора 10 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.

ОАО «Гомельоблреклама»

филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 18 июня 2021 года открытого повторного аукциона с понижением начальной цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-29284,** площадью **1 880,2 кв. м,** назначение – помещение общественного питания, наименование – **столовая. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н,г. Жлобин, пр-д Красный, 2-2	**43 190,90**	4 319,09

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07 – главный инженер Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** P/c BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 4 июня 2021 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 16 июня 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом имущества в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части), с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609. **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.06.2020 г. № 108 (29222). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

Извещение о проведении (повторных) электронных торгов

Организатор аукциона, оператор ЭТП	ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33 помещение 339. Адрес ЭТП: info@torgi24.by
Продавец	Узденское районное потребительское общество, 223411, Минская область, г. Узда, пер. К. Маркса, 7

Предмет электронных торгов:

Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена	Сумма задатка
759	Грузовой фургон ГАЗ-3309, 2008 г. в., с инв. номером 5065	1 300,00	130,00
760	Прицеп АПС-2З, 1991 г. в., с инв. номером 5072	320,00	32,00
761	ЗИЛ – 130 В1, 1984 г. в., с инв. номером 5039	980,00	98,00
762	Автомобиль ГАЗ-3307, 1999 г. в., с инв. номером 5036	620,00	62,00
763	Автомобиль ГАЗ-3307 грузовой фургон, 2000 г. в., с инв. номером 5054	620,00	62,00
764	Автомобиль ГАЗ-3307 грузовой специальный фургон, 1999 г. в., с инв. номером 5038	620,00	62,00
765	Автомобиль ГАЗ-3309 грузовой фургон изотермический, 2006 г. в., с инв. номером 5048	480,00	48,00
766	Автомобиль ГАЗ-3309 грузовой фургон изотермический, 2007 г. в., с инв. номером 5057	1 400,00	140,00
767	Грузовой специальный фургон ГАЗ-3309, 2007 г. в., с инв. номером 5059	1 400,00	140,00
768	Грузовой фургон ГАЗ-3309 изотерма, 2007 г. в., с инв. номером 5060	1 400,00	140,00
769	Автомобиль легковой специальный седан ВАЗ-21154, 2008 г. в., с инв. номером 5017	460,00	46,00
770	Автомобиль ГАЗ-3307 фургон хлебный, 2009 г. в., с инв. номером П458119	1 400,00	140,00
771	Грузовой фургон ГАЗ-3309, 2008 г. в., с инв. номером 5062	1 200,00	120,00
772	Грузовой фургон ГАЗ-3309, 2005 г. в., с инв. номером 5046	1 300,00	130,00
773	Грузовой специализированный фургон ГАЗ-3307, 1998 г. в., с инв. номером 5033	620,00	62,00
774	Мерседес Бенц 410Д, 1994 г. в., с инв. номером 5061	1 300,00	130,00

расположенные по адресу: Минская обл., г. Узда, пер. Колхозный, д. 5

Размер шага составляет 5 % от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях **(для каждого лота)** перечисляется на р/с (IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код. (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг»», размещенным по адресу: www.torgi24.by

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 % от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

Дата и время начала торгов: 07.07.2021 в 09.00. **Дата и время окончания торгов: 07.07.2021** в 16.00. Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: 05.07.2021 до 17.00 на ЭТП ООО «Расантехторг» по электронному адресу: **www.torgi24.by**

Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: linfo@torgi24.by.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

4 чэрвеня 2021 г. № 21 (606)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

Фота БелТА

ВАДА, РАМОНТ, ДАРОГІ

Жыхары аграгарадка Лясны расказалі пра свае праблемы на прыёме ў Наталлі Качанавай

Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі правялі ўчора адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінскім раёне: аг. Лясны, Сеніца, Заслаўе, г. п. Мачулішчы. Такую форму работы са зваротамі людзей прымянілі ўпершыню, каб паглядзець на праблемы па-іншаму, атрымаць аператыўную і актуальную інфармацыю. Карэспандэнт «Звязды» пабывала на прыёме старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ у Бараўлянскім сельвыканкаме (аг. Лясны).

Чыя вежа ў Валяр'янаве?

Мінскі раён — гэта прысталічча з вялікай шчыльнасцю пражывання, мноствам людзей і сваімі асаблівымі праблемамі. Падчас прыёму, на які запісалася каля 30 чалавек, высветлілася, што найбольш вострыя пытанні датычацца праблем з водазабеспячэннем, добраўпарадкаваннем і абслугоўваннем жылля.

Перадаць на баланс водаканала Мінскага раёна водапорную вежу, водаправодныя сеткі і свідравіну ўжо больш за год хочуць жыхары 170 домаўладанняў вёскі Валяр'янава. Яны сцвярджаюць, што цяпер камунікацыі знаходзяцца ў руках камерсантаў, і адмаўляюцца плаціць грошы за ваду, бо не ведаюць, у чыю кішэню яны «пацякуць». Праблему высвятляюць у тым ліку праз суд і АБЭЗ (аддзел па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі), аднак усе скаргі «блакіруюцца на ўзроўні раённага выканкама», упэўнена Кацярына Іванаўна, якая прыйшла на прыём:

— Фактычна цяпер сеткі безгаспадарчыя, хоць на паперы належаць кааператыву індывідуальных забудоўшчыкаў (КІЗ) «Лугавы», у якога няма старшыні. На вежу няма праваўстаноўных дакументаў. Мы хочам перайсці на баланс дзяржавы, каб мець дакладныя тарыфы, абслугоўванне і санітарны кантроль вады.

8 стар.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

МІНІ-ПАЛІГОНЫ — НА КАНТРОЛІ ЎЛАД І ЭКОЛАГАЎ

Мінімізаваць уздзеянне на навакольнае асяроддзе палігонаў цвёрдых камунальных адходаў — адна з задач, што актуальныя сёння для рэгіёнаў. Згодна з Нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі да 2030 года плануецца адкрыць 30 міжрэгіянальных сучасных аб'ектаў для сартавання, выкарыстання, а таксама экалагічна бяспечнага пахавання адходаў.

(Заканчэнне на 17-й стар.)

Фота БелТА

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

КАНТАКТЫ З ВЯЛІКІМ НОЎГАРАДАМ

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Алег РАМАНАЎ сустрэўся са старшынёй Думы Вялікага Ноўгарада Аляксеем МІЦЮНОВЫМ і старшынёй камітэта па турызме і замежных сувязях адміністрацыі Вялікага Ноўгарада Вольгай ВАСІЛЬЕВАЙ.

Асноўнымі тэмамі перагавораў сталі абмен досведам і перспектывы ўзаемавыгаднага беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і турызму, сумесная падрыхтоўка студэнтаў з Наўгародскім дзяржаўным універсітэтам імя Яраслава Мудрага.

Суразмоўцы выказалі ўзаемную цікавасць у далейшым развіцці стасункаў і дамовіліся аб рэалізацыі канкрэтных праектаў.

«ПАТРЫЯРШАЯ ПАДЗЯКА» СЕНАТАРУ

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК удастоена медаля Рускай праваслаўнай царквы «Патрыяршая падзяка».

Узнагароду парламентарыю ўручыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, падчас урачыстай цырымоніі, якая адбылася ў Гомельскім епархіяльным управленні. Усяго ў гэты дзень медалём «Патрыяршая падзяка» былі ўзнагароджаны 14 прадстаўнікоў сферы аховы здароўя Гомельскай вобласці.

«Вы маеце сэрца, якое адгукаецца на чалавечы боль, дапамагаеце іншым. І нехай Гасподзь умацоўвае вашы цялесныя сілы, дае дабраславенне вашым клопатам», — сказаў мітрапаліт Веньямін падчас цырымоніі. На думку Алы Смаляк, уручэнне медаля — высокая ацэнка і прызнанне яе намаганняў у імя агульных мэт і адначасова стымул удасканальвацца кожны дзень.

ДЭМАГРАФІЧНАЯ БЯСПЕКА

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ прыняў удзел у пасяджэнні сесіі Столінскага раённага Савета дэпутатаў.

На парадку дня было адно пытанне: стан медыцынскага абслугоўвання насельніцтва раёна і вынікі выканання дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» за 2016—2020 гады.

Да размовы на сесіі былі запрошаны старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў, кіраўнікі прадпрыемстваў і гаспадарак, а таксама прадстаўнікі ўпраўленняў, аддзелаў райвыканкама і раённых службаў.

КЛОПАТ АБ СПАДЧЫНЕ

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Уладзімір КАТОВІЧ прыняў удзел у пасяджэнні Светлагорскага раённага выканаўчага камітэта.

Разглядаліся пытанні захавання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, распрацоўкі і зацвярджэння ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцяў і іншыя.

Удзельнікі пасяджэння станоўча ацанілі дзейнасць установы культуры і бібліятэчнай сеткі раёна па захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны праз сістэмную навуковую і даследчую працу, фальклорныя экспедыцыі, функцыянаванне створаных уласных электронных рэсурсаў і картатэк.

ВАДА, РАМОНТ, ДАРОГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Уладзімір ЮРГЕВІЧ, старшыня Мінскага райвыканкама, у адказ заўважыў, што сеткі належаць КІЗ «Лугавы»:

— У нас ёсць рашэнне 2019 года аб водавыкарыстанні свідравіны, якая ўваходзіць у склад інжынерных камунікацый, так што сеткі небезгаспадарчыя... Няхай збіраецца сход, які і вырашыць, ці перадаваць камунікацыі водаканалу.

— Водныя камунікацыі, якія маюць такі ўплыў на жыццё людзей, не павінны знаходзіцца невядома ў чыіх руках, — пагадзілася з заяўніцай Наталля Качанава і запэўніла, што вырашаць гэтае пытанне будуць на ўзроўні краіны з удзелам ЖКГ і МУС.

Нітратная вада і затапленні ў Каралёвым Стане

Праблема з чыстай пітной вадой з люта га пануе ў дамах жыхароў вуліц Школьная, Зарэчная, Магістральная, Маскоўская ў вёсцы Каралёў Стан, расказала заяўніца Ірына Георгіеўна:

— У вадзе павышаны ўзровень нітратаў, ужываць яе нельга. Дагэтуль жыхарам і ў школы, і ў дзіцячыя сады прывозяць цыстэрны з вадой. Спачатку раённы водаканал уласнымі сіламі спрабаваў чысціць сеткі. Пасля высветлілася, што трэба набываць абсталяванне для фільтрацыі вады. А нядаўна сказалі, што пастаўшчыкі не могуць прывезці патрэбныя рэагенты.

Кіраўнік сталічнага райвыканкама патлумачыў, што комплекс па водаачыстцы вады ад нітратаў ужо збіраецца, неабходныя рэагенты будуць, і да 15 ліпеня пітная вада ізноў з'явіцца ў жыхароў. Наталля Качанава скараціла тэрмін гатоўнасці работ па комплексе да 1 ліпеня.

Адсутнасць асфальту на вуліцы Школьная ў пэўных месцах — яшчэ адна праблема, якую ўзняла Ірына Георгіеўна.

> Падчас прыёму, на які запісалася каля 30 чалавек, высветлілася, што найбольш вострыя пытанні датычацца праблем з водазабеспячэннем, добраўпарадкаваннем і абслугоўваннем жылля.

— Мы дадзім даручэнне даследаваць, наколькі сітуацыя праблематычная, магчыма, на 2022 год гэту вуліцу трэба будзе ўключыць у план работ, — паабяцала старшыня Савета Рэспублікі.

Жыхарка Мінскага раёна Тамара Уладзіміраўна папрасіла адрамантаваць страху на доме, бо вада залівае шчыток на лесвічнай пляцоўцы, і жыхары перыядычна застаюцца без святла. Два-тры разы на год выклікаюць аварыйную службу.

— У 2018-м у вашым доме рабілі бягучы рамонт страхі. У найбліжэйшы час вырашым пытанне з ліўневай каналізацыяй, якая праходзіць праз дом. Стыкі сцен, страху і трэшчыны па фасадзе адрамантуем да 1 верасня, — паабяцаў старшыня райвыканкама.

— У людзей павінна быць суха, а ад дажджу ці ад каналізацыі іх заліваe — няважна, — выказалася Наталля Качанава. — Найперш трэба зрабіць страху, каб не траціць лішнія сродкі на метад спроб і памылак. Бяда ў тым, што часта бягучыя рамонты робяцца для «адчапнога». Гэта часовыя работы, а трэба выявіць прычыну заліцця страхі, каб пасля ўстараняць гэта.

Якасць вады, паветра, харчавання — першасныя задачы і жыццёва важныя пытанні, якія мясцовым уладам трэба аператыўна вырашаць, бо ад гэтага залежыць здароўе нашых грамадзян. Многія пытанні, з якімі звярнуліся людзі, ужо вырашаюцца, рэзюмавала старшыня Савета Рэспублікі і паабяцала, што такія формы работы са зваротамі грамадзян будуць практыкаваць і ў іншых рэгіёнах краіны.

Ірына СІДАРОК.

АБМЕН ДУМКАМІ

У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГАВАЙ ПЛЯЦОЎКІ

У шчыльным і насычаным графіку старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ заўсёды знаходзіцца месца і час для сустрэч з дэпутатамі і кіраўнікамі мясцовых Саветаў. Вось і нядаўна з гэтай мэтай яна наведала Лунінецкі раён, а потым у Мінску сустрэлася са старшынямі абласных Саветаў дэпутатаў.

«Хачу вас пачуць»

На пачатку размовы з дэпутатамі Лунінецкага раёна спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што для яе асабіста вельмі важна самой ва ўсё ўнікнуць, ва ўсім пераканацца, каб потым працаваць больш эфектыўна. Таму невыпадкова летась падобныя сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовых Саветаў адбыліся ў рэгіёнах. Разам з дэпутацкім корпусам абмяркоўваліся актуальныя пытанні, бо дэпутаты — гэта тыя людзі, якія маюць поўную інфармацыю аб раёне, ведаюць нават пра тое, што адбываецца ў самай маленькай вёсачцы. Шэраг дэпутацкіх прапаноў ужо рэалізоўваецца дзякуючы іх падказцы. «Хачу пачуць вас і абмяняцца думкамі», — заклікала прысутных Наталля Качанава.

Як паведамлі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, сустрэча з дэпутатамі прайшла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі. У прыватнасці, дыскусія разгарнулася вакол злабадзённых праблем дзейнасці сельскіх Саветаў. Надышоў час мяняць падыходы ў іх рабоце, сістэму фінансавання сельсаветаў, пераконвалі суразмоўцы высокага госця. У ходзе дыялогу закранулі і іншыя актуальныя пытанні жыцця раёна: занятасць насельніцтва, роля старэйшага пакалення ў вёсках, рэалізацыя сацыяльнай палітыкі ў адносінах да шматдзетных сем'яў, патрыятычнае выхаванне моладзі, зямельныя праблемы, лёс пустых закінутых дамоў, развіццё ўзаемавыгадных сувязяў з замежнымі гарадамі-пабратымамі і іншае.

У час рабочай паездкі спікер верхняй палаты парламента таксама наведала вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Вікторыя», дзе зараз працуе 160 чалавек. Наталля Качанава засталася задаволенай пачутым і ўбачаным. Паводле яе слоў, такія сустрэчы ў працоўных калектывах, арганізацыях, установах сталі традыцыйнымі. І ўвогуле, прызналася Наталя Качанава, ёй падабаецца менавіта такая форма зносін, калі ў працоўных калектывах адказваюць на пытанні, якія хвалююць людзей.

Фота БелТА.

Падчас наведвання лунінецкага прадпрыемства «Вікторыя».

Па выніках размовы з дэпутатамі і кіраўнікамі мясцовых Саветаў раёна старшыня Савета Рэспублікі выказала рэкамендацыю: скласці прапановы для далейшага разгляду сенатарамі. Сустрэча, на яе думку, прайшла ў канструктыўным ключы.

Прыярытэт — моцныя рэгіёны

Літаральна праз некалькі дзён у Савеце Рэспублікі адбылася нарада са старшынямі абласных Саветаў дэпутатаў.

Як паведамлі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, былі абмеркаваны найбольш актуальныя пытанні, якія датычацца работы дэпутацкага корпуса, рэалізацыі грантавай сістэмы — яна па ініцыятыве дэпутатаў адпрацоўваецца ў краіне. Сенатарам таксама было важна пачуць меркаванне запрошаных па тэмах, якія патрабуюць вырашэння на найвышэйшым узроўні. На гэтым перад пачаткам размовы зрабіла акцэнт Наталля Качанава.

Яна нагадала, што адзін з прыярытэтных напрамкаў развіцця краіны на найбліжэйшую пяцігодку — моцныя рэгіёны. Менавіта там павінны стварацца вытворчасці, новыя працоўныя месцы, аб'екты сацыяльнага і культурнага прызначэння. Людзі там павінны жыць паўнавартасным жыццём.

Таму разглядаць сістэму работы мясцовых Саветаў дэпутатаў неабходна, улічваючы колькасць насельніцтва. Калі, напрыклад, у Альшанах гэта 10 тысяч, то самы невялікі сельсавет у Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці налічвае 900 чалавек. У іншых рэгіёнах яшчэ менш. У гэтай сувязі неабходна вывучыць сістэму работы мясцовых Саветаў дэпутатаў. Важна, каб гэта было эфектыўна з улікам колькасці насельніцтва. «На гэтым тыдні мы правядзём мерапрыемствы, якія пасадзейнічаюць больш дэталёваму вывучэнню работы нізавых структур дэпутацкага корпуса», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Член **Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ** адзначыў, што работа мясцовых Саветаў непасрэдна звязана з людзьмі. Таму шляхі павышэння эфектыўнасці мясцовых Саветаў абмяркоўваюцца на ўсіх узроўнях.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД ДА КАПРАМОНТУ

Звароты на тэму няякасных і зацягнутых па часе капітальных рамонтаў жылых шматкватэрных дамоў, аднаўлення іх двароў ужо ператварыліся, так бы мовіць, у «класіку жанру» падчас правядзення прамых ліній і асабістых прыёмаў грамадзян старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, мэрам сталіцы і яго намеснікамі. Мясцовая ўлада, зразумела, рэагуе на сігналы грамадзян, але па-ранейшаму скаргі на якасць капрамонтаў — у топе зваротаў.

Дарэчы, і самі мінчане ў ходзе прамых ліній нярэдка выказваюць нямала прапаноў па ўдасканаленні парадку, планаванні, правядзенні і фінансаванні капітальнага рамонту жыллёвага фонду. Нядаўна Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі было наладжана грамадскае абмеркаванне гэтай праблемы. Зразумела, не ўбаку ад яе вырашэння і мясцовыя ўлады сталіцы.

Як паведамілі ў гарвыканкаме, з 2023 года ў Маскоўскім раёне пачнуць па-новаму праводзіць капітальны рамонт дамоў. Гэта будзе комплексны падыход. Мяркуецца, што рамонт закране адначасова некалькі суседніх будынкаў. Пасля абавязкова добраўпарадкуюць двор, заменяць асфальт, адновяць дзіцячыя пляцоўкі. Вядома, перад пачаткам рамонту правядуць сходы з жыхарамі, больш увагі аддадуць распрацоўцы праектаў, іх дзяржаўнай экспертызе, арганізацыі тэндараў па выбары падрадчыкаў.

Будуць улічаны і многія іншыя моманты дадзенай работы, каб потым яна не выклікала нараканні ў гараджан. Напрыклад, з жыхарамі мінскіх дамоў абавязкова параяцца наконт правядзення цеплавой мадэрнізацыі аб'ектаў, аднаўлення пад'ездаў і г. д.

Ёсць прыемная навіна і для аматараў заняткаў фізічнай культурай на свежым паветры. Мясцовыя ўлады сталіцы разгледзелі пытанне стану і функцыянавання дваровых спартыўных пляцовак. Цяпер большасць з іх, як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, чакае паступовая і грунтоўная мадэрнізацыя. Усяго ў горадзе 285 такіх збудаванняў. Многія ўжо фізічна і маральна ўстарэлі.

Рабіць мадэрнізацыю будуць па тыпавым праекце. Распрацавана адпаведная форма шматпрофільнай спартыўнай пляцоўкі, якая стане асновай рамонту старых пляцовак. Падчас яго мяркуецца ўладкаваць штучнае пакрыццё, футбольныя вароты, баскетбольныя кольцы, іншыя спартыўныя прыстасаванні і снарады.

Адміністрацыі раёнаў і галоўнае ўпраўленне спорту і турызму Мінскага гарвыканкама ўжо ўключыліся ў гэту работу, у прыватнасці, распрацаваны графікі ходу мадэрнізацыі дваровых спартыўных пляцовак.

Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.

Маладзечна 937

СВЯТА ПЕСНІ І ПАЭЗІІ НА «БЕЛАРУСЬ 3»

З 11 да 12 чэрвеня ў Маладзечне пройдзе XX Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2021». Да праграмы свята змогуць далучыцца і гледачы сацыякультурнага тэлеканала, дзякуючы трансляцыям асноўных канцэртных праграм і аператыўным выпускам культурных навін на «Беларусь 3».

Здымачная група праекта «Навіны культуры» наведае асноўныя пляцоўкі свята і пакажа ўсе сюрпрызы і тэматычныя праекты, падрыхтаваныя арганізатарамі для жыхароў і гасцей Маладзечна ў юбілейны для фестывалю год. Спецыяльны суботні выпуск праграмы «Культурны рэпартаж» пагартае старонкі ўсёй дваццацігадовай гісторыі маладзечанскага музычна-паэтычнага форуму.

Галоўнай падзеяй першага фестывальнага дня стане ўрачыстая цырымонія адкрыцця — узнагароджанне лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні і прэм'ерная канцэртная праграма «Талака», прысвечаная памяці класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, а таксама знакамітага піяніста і аўтара песень Ігара Паліводы. Канцэртную праграму прадставяць салісты Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга.

Тэлеверсію канцэрта-адкрыцця фестывалю на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць 12 чэрвеня ў 17.20, а вечарам у 21.30 у прамым эфіры з маладзечанскага Летняга амфітэатра глядзіце святочны гала-канцэрт закрыцця форуму, праграму «Маладзечна — насустрач шлягерам» з удзелам зорак беларускай эстрады і любімых ансамбляў.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 121

Аўтар сённяшняй задачы — расійскі складальнік Генадзь Ігнаценка (*гл. дыяграму*).



Белыя: Крс5, Лс3, Кd2, Ке2 (4).
Чорныя: Крa2, Са4, пb2 (3).
Мат за 3 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Прааналізуем задачу Віктара Волчака (Беларусь) і Леаніда Макаронца (Ізраіль), адзначаную ганаровым водгукам у міжнародным конкурсе расійскага часопіса «Шахматная кампазіцыя».

Белыя: Крh8, Фс6, Лd3, Сb3, Сd4, Ка5, Кb1, пп. b6, c2, d5, g3, g4 (12).

Чорныя: Крe4, Фа1, Лh1, Лh6, Са7, Ка2, пп. b5, c3, d6, e7, h7 (11).

Мат за 3 хады.

Не вядуць да мэты спробы: 1. Фd7? ~ 2. Фf5х, 1...Лf1(f6) 2. Ф:e7+ Лe6 3. Ф:e6х, 1... Л1h5 2. Кс6 ~ 3. Лe3х, 1...Л6h5 2. gh Лf1 3. Фe6х, 2...Л:h5 3. Фg4х, але 1...e6!; 1. Фb7? ~ 2. Ф:e7+ Лe6 3. Ф:e6х, 1...Л1h5 2. Кс6, 1...Лe6 2. de+ d5 3. Ф(С):d5х, але 1...Л6h5! Рашае 1. Kb7! ~ 2. Кс5+ dc 3. d6х, 1..Л1h5 2. Фс5! ~ 3. Лe3х, 2...dc 3. К:c5х, 1...Л6h5 2. Ф:d6! ed 3. К:d6х, 2...Лf1 3. Кс5х, 2...С:b6 3. Фf4х, 1...Kb4 2. Ф:c3 Ф:c3 3. К:c3х, 2...Ф:b1 3. Лe3х, 2...К:c2 3. К2х, 1...С:b6 2. Лe3+ Кр:d4 3. Ф:b6х

* * *

У Мінску адбыліся сёлетнія чэмпіянаты Беларусі. Перамаглі Кірыл Ступак і Аляксандра Тарасенка. Падрабязнасці — у наступным выпуску.

Прызёрамі рэспубліканскага турніру «Белая ладдзя» сталі вучнёўскія каманды з Оршы, Рагачова і Мінска. Удзельнікам міжнародных гульняў гарадоў-герояў сярод вучняў у Маскве была каманда Брэста. У выніку наша суайчыннiца Аляксандра Тарасенка перамагла ў хуткіх шахматах і «бліцы», Аляксандр Алішэвіч заняў другое месца ў «бліцы».

* * *

Мы ўжо расказвалі пра сёлетнія першынствы Беларусі сярод юніёраў. Вось яшчэ дзве партыі адтуль.

Вячаслаў Зарубіцкі — Ягор Сіліч. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. Ce2 0-0 6. h4 Kc6 7. d5 Ke5 8. h5 e6 9. f4 Ked7 10. de fe 11. hg hg 12. Фd3 e5 13. f5 Kc5 14. Фh3 Kc:e4 15. K:e4 C:f5 16. K:f6+ Ф:f6 17. g4 Ce4 18. Лh2 g5 19. Kf3 Cg6 20. C:g5 Фf7 21. Ch6 e4 22. Kg5 Фf6 23. C:g7 Ф:g7 24. 0-0-0 Лae8 25. c5, 1:0.

Ксенія Норман — Караліна Галоўчыц. 1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 Cf5 4. Kc3 e6 5. g4 Cg6 6. Kge2 c5 7. h4 h6 8. Ce3 Kc6 9. dc h5 10. Kd4 hg 11. Ф:g4 Фc7 12. K:e6 Ф:e5 13. K:d5 Cf5 14. Kec7+ Kpd7 15. Фf4 Лd8 16. 0-0-0 Крc8 17. Ф:e5 K:e5 18. Cg2 Kh6 19. Kb5 Kc6 20. K:a7+ Крb8 21. K:c6+ bc 22. Kb6 Л:d1+ 23. Л:d1 Крb7 24. Лd8 f6 25. Cf4 Kf7 26. Лb8+ Крa6 27. Cf1+ Крa7 28. Лa8+, 1:0.

* * *

А вось узор гульні пераможцы нядаўняга турніру прэтэндэнтаў у Екацярынбургу.

Ян Няпомняшчы — Кірыл Аляксеенка. 1. c4 Kf6 2. g3 e6 3. Cg2 d5 4. Kf3 dc 5. Фa4+ Kbd7 6. Ф:c4 a6 7. Фc2 c5 8. Kc3 Ce7 9. 0-0 0-0 10. d4 cd 11. K:d4 Фc7 12. Лd1 Лd8 13. Ce3 Kb6 14. Лac1 e5 15. Kf5 C:f5 16. Ф:f5 Kc4 17. Cg5 Л:d1+ 18. K:d1 Лd8 19. C:f6 C:f6 20. Ce4 Фa5 21. Kc3 Крf8 22. Kd5 b5 23. Ф:h7 Л:d5 24. C:d5 Фd2 25. Л:c4 bc 26. e4 Ф:b2 27. Фh8+ Крe7 28. Фc8 Фb6 29. Ф:c4 Фb5 30. Фc7+ Фd7 31. Фc5+, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фa8! Першыя правільна адказалі Дзяніс Лазюта, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

Раскрываем талент і думкі Аляксандра Кашперава

Акцёр тэатра і кіно Аляксандр Кашпераў 11 чэрвеня будзе святкаваць свой 75-ы дзень нараджэння. І з нагоды прыгожай даты ў эфіры «Беларусь 3» для прыхільнікаў творчасці майстра падрыхтавалі падарункі. Тут чакаецца паказ фільма «Кветкі правінцыі» і спецыяльны выпуск праекта «Майстры і куміры» з удзелам заслужанага артыста Беларусі.

Уторчай біяграфіі Аляксандра Барысавіча сёння — дзясяткі роляў на тэатральнай сцэне і ў кіно. Напрыклад, у Рэспубліканскім тэатры юнага гледача акцёр дэманстраваў свой талент у такіх спектаклях, як «Чаму ж мне не пець», «З каханымі не разлучайцеся», «Зялёная птушка», а ў Тэатры-студыі кінаакцёра яго ведаюць па пастаноўках «Гамлет», «Шчаўкунок», «Таленты і прыхільнікі», «Пігмаліён» і многіх іншых.

Кінааматары могуць згадаць яго шматлікія ролі, сярод якіх удзел у карцінах «Вянок санетаў», «Сустрэча ў канцы зімы», «Наш чалавек у Сан-Рэма», «Дняпроўскі рубеж» і г. д. Яго лічаць тым акцёрам, які здольны ўвасобіць самыя розныя вобразы і праўдзіва перадаваць характары сваіх герояў.

Фільм «Кветкі правінцыі», у акцёрскім саставе якога задзейнічаны і Аляксандр Кашпераў, быў зняты рэжысёрам Дзмітрыем Зайцавым на кінастудыі «Беларусьфільм».

Кадр з фільма «Кветкі правінцыі».

Стужка ўбачыла свет у 1994 годзе і была адзначана рознымі ўзнагародамі. Асновай карціны стаў аўтабіяграфічны раман беларускага пісьменніка Георгія Марчука, у якім закранаюцца вострыя экалагічныя праблемы вёскі, паказваецца прыклад сталення чалавека і пошук ім свайго месца ў дарослым жыцці і ў вялікім свеце.

Здымкі праходзілі на радзіме аўтара — у Давыд-Гарадку і ў Пінску.

Жыццёвая і месцамі драматычная гісторыя расказвае пра маладога паэта, які спрабуе знайсці адказы на важныя для яго пытанні, у прыватнасці, чаму загінула маці? Развязку кінагісторыі зможам убачыць на «Беларусь 3» ужо ў наступную пятніцу.

Алена ДРАПКО.



«Звязда» — руплівым гаспадарам»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 13 ліпеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 16 ліпеня 2021 года будуць разыграны 7 набораў садовага інструменту Palisad 63020 і суперпрыз — бензакоса Spec-2501. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» чытайце ў нумары 101 газеты «Звязда» ад 1 чэрвеня.

Тэлефон для даведак: (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2021 да 30.09.2021.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3996 ад 25.05.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на III квартал або II паўгоддзе 2021 года

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
8.50 Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхаванне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «За крок ад раю» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25 Меладрама «Уцякачка» (16+).
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 1.00 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.40 Арэна.
1.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.30 Тэлебарометр.
9.05. 20.00 «Зразумець. Дараваць» (16+).
9.40, 20.35 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
10.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
10.55 «На тыдзень» (16+).
11.40 «Да пабачэння» (16+).
12.35 Прыгоды «Хан Сола: зорныя вайны. Гісторыі» (12+).
14.55 Анімацыя для ўсёй сям'і «Трус Піцер» (6+).
16.20 «Каралі палат». Скетчкам (16+).
17.00 «Суперлато».
17.40 «Арол і рэшка-3» (16+).
18.35 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.55 Хачу ў тэлевізар!
0.00 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Лешч, запечаны ў гліне.
8.05, 12.00, 20.20, 23.30 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
9.35, 15.40 «І на каменях растуць дрэвы». Маст. фільм (12+).
12.20 «Беларуская кухня». Запечаны бурак.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Легенды кіно». Тацяна Пельтцар (12+).
13.40, 21.30 «Два капітаны». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.15 «Навукаманія» (6+).
18.05 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
18.30 Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2019». «Зорны карагод».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.05 «Запіскі на палях». Іван Мележ: перарваныя хронікі [СЦ].

Беларусь 5

6.25 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-21). Фінал.
8.05 Вынікі тыдня.
8.50 Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал.
11.00, 18.10 Дзюдо. Чэмпіянат свету.
13.00 Тэніс. «Ралан Гарос».
15.00, 16.50 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
16.10 Гульні «на выраст».
16.40, 19.35 Спорт-цэнтр.
19.45 На грані фолу. Футбольны агляд.
21.15 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы.
0.05 Тэніс. «Ралан Гарос».

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.05 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!». Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 Серыял «Анатомія сэрца» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.10 «Загадкі чалавецтва» (16+).
11.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.35, 20.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).
18.30 Ток-шоу «Па сутнасці».
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Яловая субмарына». «АукцЫон». Як чуецца, так і пішацца» (18+).
14.25 «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
17.20 «Гумар, які мы страцілі (Гумар савецкай эпохі)». 2008 год (16+).
18.00 «Да і пасля...» 2010 год (16+).
19.20 Маст. фільм «Барханаў і яго целаахоўнік» (16+).
22.00 «Колба часу» (16+).
23.00 «Блеф-клуб» (18+).
0.00 «Быў час»: «Каратэ» (16+).
2.30 Фільм-канцэрт «Перад далёкай дарогай». 1978 год (12+).

EuroSport 1

0.30, 4.00, 8.30, 23.00 Веласпорт. «Тур Славеніі» (12+).
1.30, 5.00, 9.30 Веласпорт. «Тур Бельгіі» (12+).
2.30, 6.00, 10.30 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).

Кінакамедыя

1.15 Целаахоўнік кілера (18+).
3.35 Канваіры (16+).
5.25 Звычка расставацца (16+).

6.55 Герой супермаркета (12+).
8.35 Таўстун супраць усіх (16+).
10.20 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
12.00 Смерць на пахаванні (16+).
13.40 Шафер напракат (18+).
15.35 Таўстун на рынгу (12+).
17.30 Паляўнічыя на прывідаў (6+).
19.30 Мільянер нехаця (12+).
21.15 Старскі і Хатч (12+).
23.05 Жывёла (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25 «Паглядзім» (12+).
10.00, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.05 «Паралельны свет» (12+).
12.05, 18.00, 2.40 «Сляпая» (16+).
13.10, 3.35 «Варажбітка» (12+).
14.15 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.20 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
15.55 «Ведзьмакі свету» (16+).
16.55 «Нечысць» (16+).
19.35 «Звышнатуральны адбор» (16+).
20.40 «Чалавек-невідзімка» (16+).
21.45 Камедыя «Іншая жанчына» (16+).
23.50 Фантастыка «Тэрмінатар» (16+).
1.50 «90-я». (16+).

ТБ1000

5.35, 17.20 Доктар Хаус (16+).
7.25, 3.25 Рэальнае каханне (16+).
10.05, 1.15 Адпачынак па абмене (16+).
12.25 Людзі ў чорным (12+).
14.05 Людзі ў чорным-2 (12+).
15.35 Людзі ў чорным-3 (12+).
19.00 Змярканне (16+).

21.00 Змярканне. Сага. Маладзік (12+).
23.15 Змярканне. Сага. Зацьменне (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.40 Перакладчык (16+).
7.05 Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
8.40 Давай развядзёмся! (12+)
10.15 ЖАРА (16+).
12.05 Код апакаліпсісу (16+).
14.00, 19.00 Метад Фрэйда (16+).
15.55 Змешаныя пачуцці (16+).

17.30 Сёстры (16+).
21.00 Брат (16+).
22.40 Брат-2 (16+).
0.55 Уцёкі (16+).
2.50 Гадзіна пік (16+).
4.35 Каханне з акцэнтам (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30, 2.45 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
7.25 Сапраўдны суперкар (16+).
8.15, 18.30 У дзікай прыродзе (16+).
9.05 Каралі рыбалкі (16+).
10.00, 13.25, 22.45 АўтаSOS (16+).
11.40 Дзікі тунец (16+).
12.35, 15.55,19.20, 0.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.15 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.05 Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
21.00, 3.30 Будзе шторм (16+).
21.50 Мегазаводы (16+).
23.35 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
2.00 Турэмныя цяжкасці (16+).
4.15 Асушыць акіян (16+).
5.05 Фабрыка ежы (16+).

Discovery

8.00 Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
8.46, 16.48 Аўтасвет Майка Бруэра (12+).
9.39, 20.24 Бітва за нерухомасць (12+).
10.32, 15.00, 21.18 Дзіўны свет жывёл (12+).
11.25 Круты цюнінг (12+).
12.18 Залаты прыіск Фрэдзі Доджа (16+).
13.12 Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
14.06 Сталёвыя хлопцы (12+).
15.54, 1.47 Зорнае выжыванне (16+).
17.42, 3.30 Інжынерныя пралікі: праца над памылкамі (12+).
18.36, 2.40 Лепшы збройнік (16+).
19.30, 4.15 Геній аўтадызайну (12+).
22.12 Махінатары (12+).
23.06, 5.45 Смяротны ўлоў (16+).
0.00, 6.30 Паліцыя Іспаніі (16+).
0.54, 7.15 Аэрапорт Варшавы (12+).
5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «За крок ад раю» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.50, 15.25 Меладрама «Я ўсё памятаю». Закл. серыі (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 Маршрут пабудаваны (12+).
18.15 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Меладрама «Даравать за ўсё». 1-я і 2-я серыі (16+).
0.50 Меладрама «Белыя росы. Вяртанне» (12+).
2.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00 «На нажах» (16+).
11.00, 18.20 Серыял «Опер па выкліку-5». 1-я і 2-я серыі (16+).
12.35 «Тры першыя спатканні» (16+).
13.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
13.55 «Арол і рэшка-3» (16+).
14.50 М/с «Цімон і Пумба» (0+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД» (12+).
16.35 «Клон». Серыял (16+).
17.25 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
20.05, 21.15 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.30 Драма «Трэнер» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
07.35 «Беларуская кухня». Бабка па-панску.
08.05, 12.00, 20.20, 23.35 Навіны культуры.
08.25, 18.00 «Чырвоная каралева». Серыял. Закл. серыі (16+).
10.20 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
10.35, 15.15 «Кветкі правінцыі». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.20 «Беларуская кухня». Грачанікі.
12.50 «Сіла веры».
13.15 «Легенды кіно». Юрый Багатыроў (12+).
13.40, 21.30 «Аперацыя «Гаргона». Серыял. Закл. серыі (16+) [СЦ].
16.40 «Майстры і куміры». Аляксандр Кашпераў.
17.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
19.55 «Жывая спадчына».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.10 «Запіскі на палях». Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч: майстар эпатажу [СЦ].

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10, 11.00, 19.20 Дзюдо. Чэмпіянат свету.
8.50 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.
13.00, 16.00 Тэніс. «Ралан Гарос».
15.10 На шляху да Токіа-2020. Відэачасопіс.
15.40 Вось гэта спорт!
19.10, 23.55 Спорт-цэнтр.
21.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Прэв'ю.
21.45 Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Турцыя — Італія.
0.05 Тэніс. WTA.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 0.40 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
16.45, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзянік (12+).
18.55 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Тры акорды» (16+).
23.10 «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Летняя серыя гульняў (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 20.45, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Вялікія таямніцы» (16+).
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».

МІР

5.00 Серыял «Народжаная зоркай» (12+).
6.35, 10.40 Серыял «Следчы Пратасаў» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
16.55 Маст. фільм «Дэжа Вю» (12+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
21.40 Серыял «Пётр Першы. Завяшчанне». 1—4-я серыі (16+).
2.10 «Начны экспрэс». (12+).
3.15 Маст. фільм «Вясёлыя рабяты» [СЦ] (0+).
4.45 М/ф (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Ток-шоу «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
20.45, 23.10 Меладрама «Дарога дадому» (12+).
0.15 «Лёс чалавека» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 6.50, 8.20, 16.20, 19.35, 22.00, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Беларусы (6+).
7.05 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
7.35 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.30, 22.05 «НЗ.by».
9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
12.00, 13.50 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00, 19.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
21.00, 22.30 Серыял «Гаруноў-2» (16+).
23.55 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 14.50, 19.10, 21.00, 1.15 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Скубі Ду і адгадай хто» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
9.05 Дак. фільм (12+).
9.30 Трылер «12 малпаў» (16+).
11.40 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).
13.15 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).
14.55 «Мультпарад». «Казкі шэрага ваўка» (0+).
16.00, 20.45 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).
16.05 «Рыхтуй як шэф» (12+).
16.20 Серыял «Хваюгі» (12+).
17.45 Серыял «Гэта мы» (16+).
19.15 Серыял «Лектар» (12+).
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 Баявік «Першаму гульцу падрыхтавацца» (12+).
23.25 Драма «Рэвальвер» (16+).

ВТВ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Лаві момант» (16+).
11.40, 21.30 Серыял «#СеняФедзя» (16+).
13.15, 2.55 Серыял «Ваніны» (12+).
16.20, 2.00 Серыял «Як я стаў рускім» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.25, 3.50 «Слава богу, ты прыйшоў!» (16+)
19.30, 0.00 Серыял «Вечны водпуск» (16+).
20.30 Серыял «Сторыз» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
1.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Дарога на Кашыру.
7.05 «Ну, пачакай!» М/ф.
7.35, 18.35 «Апярэдзіўшыя Калумба. Праўдзівыя першаадкрывальнікі Амерыкі». Дак. фільм [СЦ].
8.35 «Астравы». Іван Іваноў-Вано [СЦ].
9.15 «Гусі-лебедзі», «Як адзін мужык двух генералаў пракарміў». М/ф.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.00 XX стагоддзе. «Чалюскінская эпапея». Дак. фільм.
12.20 Дарогі старых майстроў. «Аблічча неба і зямлі».
12.30, 0.00 «Шахеразада». Серыял.
13.35 «Першыя ў свеце». Дак. серыял. «Мірны атам Курчатава».
13.50 Штучны адбор.
14.30 «Справа N. Аляксей Брусілаў: прарыў да чырвоных». Дак. серыял [СЦ].
15.05 «Біблейскі сюжэт».
15.35 «Белая студыя».
16.20, 2.05 Людвіг ван Бетховен. Знакамітыя сімфоніі. Сімфонія № 7. Георг Шалці і Венскі філарманічны аркестр.
17.10 «Астравы». Эдуард Назараў [СЦ].
17.50 «Віні-Пух», «Віні-Пух ідзе ў госці». «Паляванне», «Жыў-быў сабака». М/ф.
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Леў Талстой. Таямніцы сталёвага пакоя». Фільм 1-ы.
21.35 Улада факта. «Заснаванне расійскай прасторы».
22.20 «Мой лёс». Маст. фільм.

Настальгія

6.00 «СевАлогія»: «Масквічы» (18+).
7.05 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост» (16+).
8.30 «Ранішняя пошта». 1986 год (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.00, 13.00, 15.40, 17.00, 19.50, 21.40, 23.00, 2.05, 3.40 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Быў час»: «Каратэ» (16+).
13.20, 18.50 Маст. фільм «Сёння і заўтра». 1—2-я серыі (16+).
14.30 Фільм-канцэрт «Перад далёкай дарогай». 1978 год (12+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+).
0.00 «Народжаныя ў СССР». Лепшае (12+).
1.00 Маст. фільм «Стаянка цягніка — дзве хвіліны» (16+).
2.20 «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». Па старонках перадач. 1985 год (12+).
4.00 Маст. фільм «Кантрабанда» (18+).
5.25 «Ранішняя пошта». Мода. Мода. Мода. 1988 год (12+).

EuroSport 1

1.00, 9.30 Аўтагонкі. Агляд (12+).
1.30 Скалалажанне. Тэлечасопіс «Дарога ў Токіа» (12+).
2.30, 5.30, 8.00, 11.30 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
4.00 Спартыўная гімнастыка (12+).
4.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія». Агляд (12+).
7.00 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
10.00 Веласпорт. The Cycling Show (12+).
10.30 Конны спорт. Кубак нацый (6+).

Кінакамедыя

1.05 Чорны рыцар (12+).
2.50 Найноўшы запавет (16+).
5.00 Дастаць карантышку (16+).
6.55 Эвалюцыя (12+).
8.50 Канваіры (16+).
10.45 Крутая Джорджыя (16+).
12.50 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
14.30 Акей, Лексі! (18+)
16.00 Дом з паранармальнымі з'явамі-2 (18+).
17.35 Шафер напракат (18+).
19.30 Таўстун на рынгу (12+).
21.25 Смерць на пахаванні (16+).
23.05 Целаахоўнік кілера (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.45 «Ваўчынае сонца». Маст. фільм (12+).
9.40 «Перыскоп» (16+).
10.00, 15.25, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.05 «Паралельны свет» (12+).
12.05, 18.25, 2.50 «Сляпая» (16+).
13.10, 19.35 «Варажбітка» (16+).
13.45, 3.45 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.45 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.25 «Ганна — дэтэктыў». Серыял (16+).
20.45 «Добры доктар». Серыял (16+).
22.35 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
23.40 «Глядзі сам» (16+).
23.55 «10 самых» (16+).
0.30 «Лінія абароны» (16+).
1.05 «Прывідны гоншчык». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

5.00, 17.20 Доктар Хаус (16+).
6.30 Робін Гуд (16+).
8.55 Робін Гуд: прынц зладзеяў (12+).
11.25, 2.55 Пампеі (12+).
13.10, 1.15 Скарб Амазонкі (16+).

15.00 Робін Гуд (16+).
19.00 Пяты элемент (16+).
21.10 Эвалюцыя (12+).
22.55 Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.00 Данбас. Украіна (12+).
8.00 Уцёкі (16+).
10.20 Гадзіна пік (16+).
12.20 Адрыў (16+).
13.50, 19.00 Адваротны бок Месяца (16+).
15.45 Параграф-78: фільм першы (16+).
17.20 Параграф-78: фільм другі (16+).
21.45 Сэлфі (16+).
23.40 Госці (16+).
1.10 Каханне з акцэнтам (16+).
2.50 Граніца. Таежны раман (16+).
4.50 Змешаныя пачуцці (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 2.40 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
7.15 Сапраўдны суперкар (16+).
8.05 У дзікай прыродзе (16+).
9.00 Тэхаскі ўлоў (16+).
9.50, 12.25, 16.40, 22.40 Аўта-SOS (16+).
11.35 Дзікі тунец (16+).
14.10 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.00 Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
15.50, 19.20, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
17.30 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.20 Драйляная скура (16+).
21.00, 3.25 Непакорлівы востраў (16+).
21.50 Аляска: новае пакаленне (16+).
23.30 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
1.50 Турэмныя цяжкасці (16+).
4.15 Асушыць акіян (16+).
5.05 Фабрыка ежы (16+).

Discovery

8.00, 17.42, 3.30 Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
8.46, 16.48, 22.12 Аўтасвет Майка Бруэра (12+).
9.39, 20.24 Бітва за нерухомасць (12+).
10.32, 15.00. 21.18 Дзіўны свет жывёл (12+).
11.25 Круты цюнінг (12+).
12.18 Узрываючы гісторыю (12+).
13.12 На дне акіяна (16+).
14.06 Штаб-кватэры Гітлера (16+).
15.54 Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў (16+).
18.36, 2.40 Лепшы збройнік (16+).
19.30, 4.15 Геній аўтадызайну (12+).
23.06, 5.45 Голыя і напалоханыя (16+).
0.00, 6.30 Эд Стафард: голае выжыванне (16+).
0.54, 7.15 Голыя і напалоханыя XL (16+).
1.47 Зорнае выжыванне (16+).
5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
8.50 Слова Мітрапаліта Веньяміна на Свята Узнясення Гасподняга.
9.10, 23.15 Серыял «След» (16+).
10.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «За крок ад раю» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.50, 15.25 Меладрама «Я ўсё памятаю» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 1.25 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Дак. тэлефільм АТН (12+).
22.45 Адзін дзень (12+).
1.05 Сфера інтарэсаў.
1.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 22.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00, 18.20 Серыял «Другі зрок». Закл. серыі (16+).
12.45 «Да пабачэння» (16+).
13.30 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.05. 17.25 «Арол і рэшка-3» (16+).
15.00 М/с «Цімон і Пумба» (0+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД» (12+).
16.35 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.25 «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
23.50 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
07.35 «Беларуская кухня». Свіное калена па-аўцюкоўску.
08.05, 12.00, 20.20, 23.30 Навіны культуры.
08.25, 18.00 «Чырвоная каралева». Серыял (16+).
10.20 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
10.35, 15.30 «Мама выйшла замуж». Маст. фільм (12+).
12.20 «Беларуская кухня». Варэнікі з чарніцамі.
12.50 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
13.30, 21.05 «Легенды кіно». Юрый Якаўлеў (12+).
13.55, 21.30 «Аперацыя «Гаргона». Серыял. 1-я і 2-я серыі (16+) [СЦ].
16.50 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
17.05 «Кадры жыцця». Рэжысёр, пісьменнік Уладзімір Мароз.
19.55 «Жывая спадчына».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.05 «Запіскі на палях». Максім Танк: крутыя віражы [СЦ].

Беларусь 5

7.00, 11.00, 18.00 Дзюдо. Чэмпіянат свету.
8.30 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны.
11.00 Дзюдо. Чэмпіянат свету.
13.00 Наперад у мінулае. Еўра-2020. Хранікальна-дакументальны фільм.
13.30 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі.
15.25 Слэм-данк.
16.00 Тэніс. «Ралан Гарос».
17.50, 20.50, 23.00 Спорт-цэнтр.
18.00, 23.40 Дзюдо. Чэмпіянат свету / Тэніс. «Ралан Гарос».
21.00 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Фларэнцыя.
23.10 Фактар сілы.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.55 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.05 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.50 Серыял «Анатомія сэрца» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.10 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 20.45, 0.50 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.30, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».

МІР

5.00, 3.35 Серыял «Народжаная зоркай» (12+).
7.40, 10.10, 23.30, 0.10 Серыял «Следчы Пратасаў» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
18.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
3.10 «Свет пераможцаў» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Ток-шоу «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Па розных берагах» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 6.50, 8.20, 16.20, 19.35, 22.00, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.15 Беларусы (6+).
7.05 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
7.35 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.30, 22.05 «НЗ.by».
9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
12.00, 13.50 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00, 19.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
21.00, 22.20 Серыял «Гаруноў-2» (16+).
23.45 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 15.25, 17.25, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.30 «Мультпарад». «Скубі Ду і адгадай хто» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.20 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
9.50 Клуб «Баланс» (12+).
10.00 Трылер «Эвалюцыя Борна» (16+).
12.15 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).
13.50 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).
15.50, 20.45 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).
16.00 Серыял «Хваюгі» (12+).
17.30 Серыял «Гэта мы» (16+).
19.00 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
19.15 Серыял «Лектар» (12+).
20.50 «Вечарніца» (6+).
21.05 Камедыя «Дэжа Вю» (16+).
22.50 Трылер «12 малпаў» (16+).
1.00 «Надвор'е».

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «Лаві момант» (16+).
11.40, 21.30 Серыял «#СеняФедзя» (16+).
13.15, 2.55 Серыял «Вароніны» (12+).
16.20, 2.00 Серыял «Як я стаў рускім» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.25, 3.50 «Слава богу, ты прыйшоў!» (16+)
19.30, 0.00 Серыял «Вечны водпуск» (16+).
20.30 Серыял «Сторыз» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
1.00 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 Лета Гасподняе. Ушэсце [СЦ].
7.05 «Ну, пачакай!» М/ф.
7.35, 18.35 «Загадка старажытнага пахавання: гендарная рэвалюцыя». Дак. фільм [СЦ].
8.35 «Астравы». Эдуард Назараў [СЦ].
9.15 «Віні-Пух», «Віні-Пух ідзе ў госці», «Паляванне». «Жыў-быў сабака». М/ф.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.00 XX стагоддзе. «Святкаванне 70-годдзя Булата Акуджавы».
12.30, 0.00 «Шахеразада». Серыял.
13.35 Дарогі старых майстроў. «Мсцёрскія галандцы».
13.50 Абсалютны слых.
14.30, 2.20 «Школа Льва Талстога». Дак. фільм.
15.05 Маё каханне — Расія! «Валагодскія каруначніцы» [СЦ].
15.30 «2 Вернік 2». Яўген Ткачук і Элеанора Севенард.
16.20 Людвіг ван Бетховен. Знакамітыя сімфоніі. Сімфонія № 6. Герберт Блумстэт і Сімфанічны аркестр Гевандхауса.
17.15 «Раман Качанаў. Лепшы сябар Чабурашкі». Дак. фільм [СЦ].
17.55 «Кракадзіл Гена», «Чабурашка». М/ф.
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Леў Талстой. Таямніцы сталёвага пакоя».
21.35 «Энігма». Васіліса Бяржанская.
22.20 «Мой лёс». Маст. фільм.
2.45 Колер часу. Жан Агюст Дамінік Энгр.

Настальгія

6.00 «Быў час»: «Каратэ» (16+).
7.00, 9.40, 11.00, 13.50, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20, 12.50, 19.20 Маст. фільм «Сёння і заўтра» (16+).
8.30 Фільм-канцэрт «Перад далёкай дарогай». 1978 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00. 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
18.00 «Яловая субмарына». «АукцЫон». Як чуецца, так і пішацца» (18+).
20.25 «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
23.20 «Гумар, які мы страцілі (Гумар савецкай эпохі)». 2008 год (16+).
0.00 «СевАлогія»: «Масквічы» (18+).
1.05 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост» (12+).
2.30 «Ранішняя пошта». 1986 год (16+).

EuroSport 1

0.00, 2.30, 6.00, 11.00 Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
1.00 Аўтагонкі. Турынг (12+).
4.00, 8.30 Веласпорт. «Тур Славеніі» (12+).
05.00, 9.30 Веласпорт. «Тур Бельгіі» (12+).
10.30 Гольф. PGA-тур. Агляд (6+).
22.50 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Жывыя легенды». Надзя Каманечы (12+).
23.00 Шахматы. Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (6+).

КИНОКОМЕДИЯ Кінакамедыя

1.15 Аднойчы пераступіўшы закон (6+).
3.40 Герой супермаркета (12+).
5.20 Таўстун супраць усіх (16+).
7.05 Чалавек, які занадта мала ведаў (16+).
8.50 Тупы і яшчэ тупейшы-2 (16+).
10.50 Таўстун на рынгу (12+).
12.45 Дом з паранармальнымі з'явамі (16+).
14.20 Дом з паранармальнымі з'явамі-2 (18+).
15.50 Крутая Джорджыя (16+).
17.55 Жывёла (12+).
19.30 Бабро паржалаваць (16+).
21.35 Поспехаў, Чак (16+).
23.25 Эвалюцыя (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.30 «Ваўчынае сонца». Маст. фільм (12+).
9.25, 23.40 «Улегцы» (12+).
10.00, 15.25, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.05, 3.40 «Паралельны свет» (12+).
12.05, 18.25, 2.45 «Сляпая» (16+).
13.10. 19.35 «Варажбітка» (16+).
13.45 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.45 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.25 «Ганна — дэтэктыў». Серыял (16+).
20.45 «Добры доктар». Серыял (16+).
22.35 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.20 «Хопіць чутак» (16+).
0.55 «Афера Томаса Краўна». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

5.00, 17.20 Доктар Хаус (16+).
6.50 Спяшайся кахаць (12+).

8.45 Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).
11.10 Пяты элемент (16+).
13.25, 23.50 Эвалюцыя (12+).
15.10, 3.55 Чаго хочуць жанчыны (16+).
19.00 Людзі ў чорным (12+).
20.35 Людзі ў чорным-2 (12+).
22.05 Людзі ў чорным-3 (12+).
1.35 Тая яшчэ парачка (18+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Адрыў (16+).
7.50 Госці (16+).
9.15 Сэлфі (16+).
11.15 Давай развядзёмся! (12+)
13.00 Адваротны бок Месяца (16+).
15.40 Адрыў (16+).
17.10 ЖARA (16+).
19.00 Метад Фрэйда. Серыял. 1—2-я серыі (16+).
20.50 Каханне з акцэнтам (16+).
22.40 Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
0.05 Змешаныя пачуцці (16+).
1.30 Код апакаліпсіса (16+).
3.30 Кіроўца для Веры (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30, 2.35 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
7.20 Сапраўдны суперкар (16+).
8.10 У дзікай прыродзе (16+).
9.05 Тэхаскі ўлоў (16+).
9.55, 13.20, 22.40 Аўта-SOS (16+).
11.35 Дзікі тунец (16+).
12.30, 16.40 Непакорлівы востраў (16+).
14.10 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.00 Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
15.50, 19.20, 0.20, 3.25 Расследаванні авіякатастроф (16+).
17.30 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.20 Драўляная скура (16+).
21.50 Злавіць кантрабандыста (16+).
23.30 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
1.55 Турэмныя цяжкасці (16+).
4.15 Асушыць акіян (16+).
5.05 Фабрыка ежы (16+).

Discovery

8.00, 17.42, 3.30 Джэрэмі Уэйд: таямніцы акіяна (16+).
8.46, 16.48, 22.12 Аўтасвет Майка Бруэра (12+).
9.39, 20.24 Бітва за нерухомасць (12+).
10.32, 15.00, 21.18 Дзіўны свет жывёл (12+).
11.25 Круты цюнінг (12+).
12.18 Голыя і напалоханыя (16+).
13.12 Эд Стафард: голае выжыванне (16+).
14.06 Голыя і напалоханыя XL (16+).
15.54, 1.47 Зорнае выжыванне (16+).
18.36, 2.40 Лепшы збройнік (16+).
19.30, 4.15 Геній аўтадызайну (12+).
23.06, 5.45 Залаты прыіск Фрэдзі Доджа (16+).
0.00, 6.30 Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
0.54, 7.15 Самагоншчыкі (18+).
5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)

Змяніць месца жыхарства дзеля месца работы

РЫНАК ПРАЦЫ

Кожнаму беспрацоўнаму Падзвіння — пяць вакансій

Паводле слоў намесніка старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, кіраўніка Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандра ХРЫСТАФОРАВА, сёння ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Падзвінні — прыкладна 0,3 %. І ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ён не змяніўся. На ўліку ў якасці беспрацоўных знаходзіцца менш за 1,5 тысячы чалавек.

У той жа час наймальнікамі заяўлены звесткі аб больш чым 7,7 тысячы свабодных працоўных месцаў, што на 27,4 % больш, чым у мінулым годзе. Такім чынам, на аднаго беспрацоўнага прыпадае пяць вакансій.

> Усё больш людзей цікавіцца магчымасцю атрымаць садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму. Усё больш у трэндзе быць рамеснікам.

Субсідыя даецца ў памеры адзінаццаці разавых велічынь бюджэту пражыткавага мінімуму. На сёння гэта тры тысячы рублёў. А ў малых гарадах і раёнах з высокай напружанасцю на рынку працы, а таксама ў сельскіх населеных пунктах — у памеры пятнаццаці разавых велічынь (4,1 тысячы рублёў). І яшчэ больш пры арганізацыі беспрацоўнымі бізнесу, звязанага з укараненнем вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак. Дарэчы, сёлета субсідыі атрымалі больш за сорак чалавек.

У беспрацоўных ёсць магчымасць пры фінансавай падтрымцы дзяржавы змяніць месца жыхарства. Пераезд і працаўладкаванне ажыццяўляюцца ва ўзгодненыя з наймальнікам тэрміны, прадугледжаныя ў дамове. Пры гэтым беспрацоўным робіцца выплата грошай (упраўленнем па працы па месцы знаходжання наймальніка) у памеры сяміразовай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму. Дадаткова — выплата ў памеры двухразовай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму пры перасяленні з гарадоў на новае месца жыхарства і работы ў малыя, сярэднія гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, а таксама гарады-спадарожнікі.

Як падкрэсліў Аляксандр Хрыстафораў, такім чынам, пачынаючы з 1990-х гадоў, змянілі месца жыхарства дзеля новай работы каля 2,3 тысячы сямей, у тым ліку сёлета — дзесяць.

Наколькі пандэмія паўплывала на ўсё, што звязана з рынкам працы?

У Віцебскай вобласці, якая мяжуе з Расіяй, яна паспрыяла вяртанню дадому многіх з тых, хто працаваў у суседняй краіне. Ды і наогул прайшоў час, калі было папулярна ездзіць «па рубель» у Маскву, Падмаскоўе і гэтак далей. Усё больш беларусаў разумеюць, што не такі ён ужо і «доўгі», гэты рубель, што нярэдка не абыходзіцца без падману. На радзіме ж, як мовяць, і сцены дапамагаюць.

COVID-19 таксама стаў прычынай больш актыўнага выкарыстання інфармацыйных тэхналогій пры пошуку месцаў работы. А ў Прыдзвінні, дарэчы, першымі пачалі праводзіць электронныя кірмашы вакансій. Каб больш эфектыўна дапамагаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі знайсці сабе прымяненне, з пазамінулага года ўкаранілі практыку іх суправаджэння падчас працаўладкавання: з пачатку пошуку да сумеснага візіту да працадаўцы.

А якая сітуацыя ў віцебскай глыбінцы?

І там яна стабільная, канстатуюць эксперты. Пры гэтым прыдумваюць новыя падыходы. У прыватнасці, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Чашніцкага райвыканкама Людміла Галавешка расказала пра вопыт стасункаў з жыхарамі Новалукомля. Ім больш не трэба прыязджаць па пытаннях пошуку працы ў райцэнтр, бо па аўторках арганізаваны выязны прыём. Штоквартальна арганізоўваюць тэматычныя прамыя лініі. У сярэднім у раёне шукаюць работу менш за 2,5 месяца. Каб задаволіць інтарэс, актыўна выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці. У прыватнасці, рэсурсы раённай газеты, дзе ёсць інфармацыя аб вакансіях.

Начальнік аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аршанскага раённага выканаўчага камітэта Марына Ляхава канстатуе, што ў грамадзян ёсць магчымасць атрымаць новую прафесію, пакуль яшчэ не звольнілі па скарачэнні штатаў. Вельмі шчыльна ў гэтым кірунку вядзецца супрацоўніцтва з ільнокамбінатам. Напрыклад, больш не запатрабаваныя на прадпрыемстве ткачы могуць стаць аператарам ільночасальнай машыны і кантралёрам якасці. Служба занятасці аплачвае выдаткі на перанавучанне. І гэта вельмі выгадна працадаўцам.

Асаблівая тэма — дапамагчы знайсці работу тым, хто адбываў пакаранне. У раёне дзве ўстановы папраўчай сістэмы. І зноў жа біржа працы фінансава падтрымлівае правядзенне майстар-класаў, каб на волі чалавек змог самастойна зарабляць. Такім чынам, толькі летась каля дваццаці пяці грамадзян атрымалі прафесіі, якія вельмі цэняцца: слесара, токара, маляра, станочніка дрэваапрацоўчых станкоў, рэзчыка па дрэве, фрэзероўшчыка, заточніка.

Сёння для ўсіх беспрацоўных вядзецца навучанне па трыццаці пяці прафесіям. Акрамя пералічаных вышэй, можна набыць прафесіі сантэхніка, цырульніка, кухара, кандытара, слесара па рамонце аўто, вадзіцеля пагрузчыка, майстра па манікюры і гэтак далей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МІНІ-ПАЛІГОНЫ — НА КАНТРОЛІ ЎЛАД І ЭКОЛАГАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Адзін з такіх шматфункцыянальных комплексаў да 2023 года пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю і на тэрыторыі Гомельскага раёна. Сучасны аб'ект не толькі паспрыяе забеспячэнню належнага санітарнага стану тэрыторыі абласнога цэнтра і Гомельскага раёна, але і вырашыць экалагічныя праблемы: эпідэміялагічную ахову людзей, ахову глебы і вады ад забруджвання — для Чачэрскага, Веткаўскага, Добрушскага, Рэчыцкага і Лоеўскага раёнаў. Глыбіня перапрацоўкі адходаў на новым шматфункцыянальным комплексе складзе каля 70 %.

> Але пакуль закрыццё пляцовак для часовага ўтрымання адходаў выклікае пэўную напружанасць, стала складана забяспечваць санітарны парадак, адзначаюць у сельсаветах.

Між тым у Гомельскім раёне працягваецца планамерная работа па закрыцці пляцовак для часовага складзіравання адходаў. У адпаведнасці з вышэйадзначанай нацыянальнай стратэгіяй неабходна ліквідаваць у рэгіёнах усе міні-палігоны да 2022 года, а зваленую зямлю далучыць да сельгасабароту або перадаць у лясны фонд. Але пакуль закрыццё пляцовак для часовага ўтрымання адходаў выклікае пэўную напружанасць, стала складана забяспечваць санітарны парадак, адзначаюць у сельсаветах.

На тэрыторыі Шарпілаўскага сельсавета няма ніводнага міні-палігона (апошні закрылі летась), таму вываз цвёрдых камунальных адходаў — адна з актуальных праблем. Па словах **старшыні сельвыканкама Дзмітрыя ЯРШОВА**, сітуацыя пагаршаецца тым, што на тэрыторыі сельсавета шмат дамоў сезоннага пражывання: у Шарпілаўцы лецішчаў — 40 %, у Новых Дзятлавічах — каля 70 %.

— Мы пастаянна праводзім тлумачальную работу з вяскоўцамі, расказваем пра карысць цэнтралізаванага вывазу цвёрдых камунальных адходаў, таму многія жыхары сельсавета і нават некаторыя дачнікі заключылі дагаворы з Гомельскім райжылкамгасам, — адзначае Дзмітрый Яршоў. — Аднак сёння камунальная служба прапануе аплачваць гэтую паслугу на працягу ўсяго года, што нявыгадна для тых, хто пражывае тут усяго некалькі месяцаў.

Калі на тэрыторыі сельсавета дзейнічалі два міні-палігоны, людзі вывозілі туды адходы, хай і без аплаты, але ўсё-ткі везлі да месца іх размяшчэння. Цяпер жа ўсё часцей можна ўбачыць адходы, у тым ліку старую бытавую тэхніку, на кантэйнерных пляцоўках паблізу грамадзянскіх могілак. Вядома, несанкцыянаваны вываз адходаў пагражае штрафам.

— Лічу, што з улікам сітуацыі, якая склалася, закрываць міні-палігоны неабходна толькі пасля ўводу ў эксплуатацыю комплексу па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, — дзеліцца старшыня сельвыканкама.

Сёння, улічваючы запланаваныя тэрміны ўводу гэтага комплексу, Гомельскі райвыканкам разглядае пытанне аб працягу эксплуатацыі пяці міні-палігонаў да завяршэння будаўніцтва названага аб'екта.

— На дадзены момант на тэрыторыі Гомельскага раёна дзейнічаюць сем міні-палігонаў агульнай плошчай 14,7 гектара. Яны размешчаны ў населеных пунктах Урыцкае, Бабовічы, Даўгалессе, Яроміна, Клімаўка, Новыя Цярэшкавічы і Рудня Марымонава. З-за таго, што ў мінулым годзе на тэрыторыі раёна былі закрытыя і рэкультываваныя сем міні-палігонаў, нагрузка на тыя, што працуюць, значна ўзрасла. Між тым у бягучым годзе будуць закрыты і рэкультываваныя яшчэ дзве пляцоўкі для складавання адходаў, — адзначыла **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага райвыканкама Валерыя ШАЦІЛА.**

Наладжванне работы па абыходжанні з адходамі ўскладняецца таксама і таму, што ў Гомельскім раёне адсутнічае буйны палігон для адходаў.

— У выпадку закрыцця ўсіх невялікіх пляцовак вывазіць цвёрдыя камунальныя адходы будуць на палігон «Барацьба» Веткаўскага раёна, размешчаны

за 60 кіламетраў ад абласнога цэнтра. Гэта значна павысіць кошт паслугі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі для насельніцтва, — тлумачыць Валерыя Шаціла.

Сёння ў раёне на дзеючых міні-палігонах вядзецца работа па ўшчыльненні адходаў, прыбіранне навакольных участкаў і пад'язных шляхоў. Каб абараніць прылеглую тэрыторыю ад забруджвання, неабходна ахоўнае збудаванне — абвалаўка вышынёй не менш за тры метры. Гэтыя работы будуць выкананы на ўсіх міні-палігонах.

Дарэчы, сёлета на Гомельшчыне ў цэлым плануюць рэкультываваць 25 міні-палігонаў для цвёрдых камунальных адходаў. Летась было закрыта 47. Ужо ў 12 раёнах міні-палігонаў няма наогул. І ўсё ж поўнае спыненне іх эксплуатацыі патрабуе больш высокага ўзроўню арганізацыі збору адходаў ад насельніцтва, у тым ліку і ў сельскай мясцовасці. Да гэтага часу ў некаторых раёнах застаецца нізкім узровень развіцця інфраструктуры для збору адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў. За мінулы год, напрыклад, тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды выявілі амаль 4,5 тысячы фактаў размяшчэння адходаў у несанкцыянаваных месцах, да адказнасці было прыцягнута каля 400 чалавек.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У тэму

На тэрыторыі Гомельскага раёна паспяхова працуе тэхналагічная лінія сартавання другасных матэрыяльных рэсурсаў, што адкрыта ў аграгарадку Яроміна. Сюды паступаюць адходы з пластыку, паперы і шкла. За змену работнікі вытворчасці сартуюць у сярэднім да трох тон адходаў з розных населеных пунктаў Гомельскага раёна.

З уводам лініі ў эксплуатацыю ўдалося не толькі вырашыць праблему збору і сартавання другасных матэрыяльных рэсурсаў, але і атрымаць даход ад здачы другаснай сыравіны перапрацоўчым прадпрыемствам.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

А ШТО ПАСЛЯ ДАЖЫНАК?

Раённая камісія па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання вывучала сітуацыю з добраўпарадкаваннем у Высокім

Пастаянная камісія Камянецкага раённага Савета дэпутатаў па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання на мінулым тыдні збіралася ў горадзе Высокае. Афіцыйна пытанне, якое вынеслі на разгляд, гучала так: «Аб мерах, якія прымаюцца Высокаўскім гарадскім Саветам дэпутатаў, па забеспячэнні годных умоў пражывання і жыццядзейнасці насельніцтва».

— А калі гаварыць прасцей, мы сабраліся з дэпутатамі, каб паглядзець, што зроблена ў горадзе пасля дажынак 2018 года, як развіваецца 5-тысячны населены пункт, — сказала карэспандэнту «МС» **старшыня камісіі Людміла ЖУРАЎЛЁВА.** — Зразумела, што пад дажынкі былі выдзелены значныя сродкі, і невялікі горад перажыў абнаўленне. Многа было зроблена па замене інжынерных камунікацый, праведзены рамонт часткі жылога фонду, шмат зроблена ў плане добраўпарадкавання вуліц, двароў. Але не менш важна, каб з мерапрыемствамі «пад дажынкі» клопаты пра знешні выгляд, якасць жыцця людзей не заканчваліся.

Вось на гэта і звярнулі асаблівую ўвагу дэпутаты, наведваючы шэраг аб'ектаў. **Старшыня Высокаўскага гарвыканкама Аляксандр РАГАЛЬЧУК** расказаў дэпутатам, якая работа вядзецца па добраўпарадкаванні, як у гэтай рабоце ўдзельнічаюць самі гараджане. Штогод праводзяцца суботнікі, высаджваюцца кветкі на клумбах, садзяцца маладыя дрэвы і кусты, паляпшаюцца дарогі і двары.

Яшчэ да дажынак была адрамантавана і мадэрнізавана школа разам са школьнай тэрыторыяй. А летась работу працягнулі. Быў праведзены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй стадыёна Высокаўскай сярэдняй школы (другі пускавы комплекс). Уладкаваны футбольнае поле, пляцоўкі для скачкоў у даўжыню, бегавыя дарожкі, сектар для кідання кап'я. Цяпер вучні могуць займацца ў секцыях па многіх відах спорту.

Уведзены ў эксплуатацыю жылы дом па вуліцы Сацыялістычнай. ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» прафінансавала закупку і ўстаноўку дзіцячага гульнявога комплексу ў двары дома. Яшчэ адзін комплекс паставілі паміж дамамі па вуліцы Зоі Космадзям'янскай і інтэрнатам па вуліцы 60 гадоў Кастрычніка. Грошы на пакупку апошняга ўдалося выручыць з аўкцыёну па продажы зямельных участкаў, якія канфіскуюцца ў гаспадароў, што так і не распачалі будаўніцтва. На чэрвень зноў прызначаны такі аўкцыён. Выручаныя сродкі плануецца патраціць на пакупку лавак, сметніц, усталяванне пясочніцы для дзяцей.

У адказ на звароты выбаршчыкаў уладкавана месца для сезоннага гандлю прадукцыяй, вырашчанай на прысядзібных участках.

Падчас работы дэпутаты засяродзілі ўвагу і на тых пытаннях, што яшчэ не вырашаны і застаюцца на кантролі. Найперш гэта асфальтаванне вуліц Свярдлова, Гагарына, Заслонава, Кірава, Арджанікідзэ, Мяжэніна, Беларускай. Вулічнае асвятленне патрабуецца на дваровай тэрыторыі трох дамоў па вуліцы Будаўнікоў. Квартал жылой забудовы ў раёне вёскі Кавалікі неабходна падключыць да цэнтральнай каналізацыі. Работа па вырашэнні пытанняў будзе прадоўжана, запэўніў кіраўнік мясцовай улады ў Высокім.

Як адзначыла **старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў Ірына НЕГЯРЫШ**, дэпутацкая камісія па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання працуе даволі эфектыўна. Усе яе пасяджэнні праходзяць з абавязковым выездам на месца. Дэпутаты сустракаюцца з людзьмі, інфармацыю атрымліваюць з першых вуснаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Камянецкі раён.

Фота з сайта газеты «Навіны Камянеччыны».

Асцярожна, «развод»!

Тры разы правесці пыласосам па вентыляцыі — паслуга за 195 рублёў

На днях да мяне завіталі нечаканыя госці. У дзверы кватэры пазванілі. На парозе стаялі два хлопцы ў цёмна-сініх куртках са святлоадбівальнікамі, пазначаныя бэйджыкамі. І самае дзіўнае, з пыласосам і нейкай палкай ці кіем у руках.

Не паспела я і слова сказаць, як яны паведамілі: маўляў, мы па дагаворы з ЖЭСам будзем чысціць у вас вентыляцыю. І імкліва пакрочылі ў кухню.

Без майго дазволу хлопцы ўключылі пыласос, адзін з іх стаў на табурэтку, каб дацягнуцца да выцяжкі. Я выключыла пыласос.

— Вы што, адмаўляецеся? У такім выпадку вам пагражае вялікі штраф, — пачалі палохаць яны.

— За што і ад каго? — запыталася я. — Ад вашай камерцыйнай фірмы? Але я не абавязана карыстацца паслугай, якую не заказвала. Па-першае, вы павінны праверыць цягу ў вентыляцыі, перш чым чысціць канал. А гэта планава робяць работнікі ЖЭСа, прычым бясплатна. І гэта простая працэдура. Да вентыляцыйнай рашоткі падносіцца запалка, якая гарыць, або чысты аркуш паперы. Нядаўна нас наведалі камунальнікі з планавай праверкай і ніякіх няспраўнасцяў не знайшлі. А калі б знайшлі, то папярэдзілі б уласнікаў, каб тыя тэрмінова выклікалі спецыялістаў адпаведнага профілю. Яны ажыццяўляюць прачыстку спецыяльным прыборам з даху або гарышча.

— Калі вы адмаўляецеся, мы выпішам вам штраф, — заладзілі нязваныя «госці». І сунулі пад нос нейкую паперчыну, нібыта дагавор на выкананне работ. Краем вока глянула ў гэты дакумент і вельмі здзівілася. Атрымліваецца, што я сама па сваёй добрай волі звярнулася па паслугу да гэтых «майстроў». А кошт паслугі яны ацанілі аж у 195 рублёў.

Я папрасіла камерсантаў пакінуць кватэру. Але яны і не збіраліся сыходзіць, спадзеючыся выпатрабаваць грошы ў «гэтай незгаворлівай жанчыны». І толькі калі я ўзяла ў рукі тэлефон і сказала, што выклікаю міліцыю, яны неахвотна пасунуліся да дзвярэй.

А праз колькі часу зноў нехта звоніць. На парозе суседка — жанчына гадоў за семдзесят, якая пражывае адна ў двухпакаёўцы:

— Дзетачкі мае, якая ж я дурніца! Падпісала дагавор, аддала 195 рублёў, гэта амаль што палова маёй пенсіі. І за што? Яны ж некалькі разоў правялі пыласосам па вентыляцыі ды патыркалі туды нейкай палкай. І галоўнае, запатрабавалі разлічыцца наяўнымі грашыма.

Калі «майстры» пакінулі кватэру, жанчына вырашыла патэлефанаваць у ЖЭС, пацікавіцца, чаму такая дарагая паслуга. Ёй адказалі, што нікога не пасылалі для чысткі вентыляцыі. І тады да яе дайшло, што яе «развялі», як неразумнае дзіця.

«Як жа вярнуць грошы?» — ламантавала суседка. Мы параілі звярнуцца ў Таварыства абароны спажыўцоў. Магчыма, там дапамогуць, напішуць іск у суд. Але, як паказвае практыка, рэдка каму тое ўдаецца. Сам жа чалавек замацаваў дагавор уласным подпісам.

Як аказалася, такія масіраваныя «набегі» адбыліся ў кватэрах ўсяго пасёлка аўтазаводцаў, што ў сталіцы. «Майстры» ходзяць звычайна ў рабочы час, калі дома застаюцца пенсіянеры ці маладыя мамы з дзецьмі. Іх лягчэй «апрацаваць», напалохаць штрафамі, а то і страшнымі наступствамі, калі адмовяцца ад паслугі. Маўляў, могуць адбыцца пажар, атручэнне газамі, якія назапашваюцца пры няспраўнай вентыляцыі. Але, запэўніваюць яны, няшчасце можна папярэдзіць. Толькі не трэба шкадаваць грошай, бо потым здароўя не купіш. А калі адбудзецца выбух, загарыцца кватэра, давядзецца шукаць куток, туліцца па сваяках.

Сапраўды, навучаныя розным хітрасцям «спецыялісты» спачатку палохаюць людзей — кожны па сваім профілі. Напрыклад, так званыя фільтроўшчыкі — атручэннем ад спажывання няякаснай вады з крана, электрыкі — пажарам ад замыкання і г. д. Нягледзячы на тое што паслугі нятанныя, жыхары загаджаюцца за іх заплаціць. Работа здадзена. І нібыта ўсё па законе — дагавор жа заключаны. І толькі праз колькі часу разумееш, што зрабіў вялікую памылку. Як раяць людзі, якія трапілі ў падобную сітуацыю, перш чым пусціць у дом незнаёмцаў, трэба ўпэўніцца, што гэта не махляры, запатрабаваць пасведчанне. І калі засумняваліся ў іх праўдзівасці, званіць у ЖЭС. А калі і гэта не дапамагае, тэлефанаваць у міліцыю.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2021 года.

Грані

ЕШ НА ЗДАРОЎЁ?

Топ-10 тыповых для беларусаў памылак у харчаванні, якія перашкаджаюць добра сябе адчуваць

Не, мы зараз не пра стройнасць — хоць і пра яе таксама. Памылкі ў харчаванні цягнуць за сабой велізарныя праблемы са здароўем. Сёння медыкі звязваюць з няправільным харчаваннем не толькі лішнюю вагу і гарманальныя парушэнні. Урачы кажуць, што з парушэннямі харчавання на працягу многіх гадоў можа быць звязана нават развіццё анкалагічных захворванняў.

Мы спыталі **дыетолага, начальніка аддзела харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Наталлю БЕЛЯКОВУ** пра найбольш тыповыя для людзей нашай краіны памылкі ў харчаванні. І аказалася, што гэта не смажаная бульбачка з маянэзам — сёння людзі значна больш адукаваныя ў пытаннях здаровага ладу жыцця, чым яшчэ 15-20 гадоў таму. І ўсё ж памылак хапае.

Памылка 1. Занадта вялікія порцыі

Існуе простае правіла французскіх дыетолагаў: ежы ў адзін прыём можна з'есці столькі, колькі змясцілася б у дзвюх вашых далонях, складзеных коўшыкам, — і не болей. Звычка есці, пакуль не стане дрэнна, — вораг вашага здароўя. Памятайце: на тое, каб арганізм усвядоміў, што сыты, неабходна каля 15 хвілін.

— Ежа — не толькі крыніца задавальнення, яна павінна быць яшчэ і крыніцай энергіі, бадзёрасці, — кажа спецыяліст. — Калі пасля прыёму ежы вы адчуваеце сябе знясіленым, стомленым і хочаце паляжаць, значыць, колькасць ежы была залішняй. І яшчэ адзін нюанс. І ў пытанні памеру порцыі на адзін прыём, і каларыйнасці з'едзенага за дзень важна ўлічваць свой узрост — тое, чаго ў нас не робяць. З узростам абмен рэчываў запавольваецца, скарачаюцца энергазатраты. Таму важна памяншаць порцыі і зніжаць каларыйнасць харчавання ў цэлым.

Памылка 2. Доўгія перапынкі паміж трапезамі

Гэта — вынік таго, пра што мы казалі вышэй: шмат з'елі — доўга чакаем, пакуль прагалодаемся. Харчаванне павінна быць не толькі збалансаваным, але і рэгулярным. Есці адзін і нават два разы на дзень — відавочная памылка, якая наносіць удар па стрававальнай сістэме і па здароўі ў цэлым. Да таго ж пачуццё голаду правакуе пераяданне. Аптымальны варыянт — тры асноўныя прыёмы ежы і два перакусы.

— Важна імкнуцца да такога рэжыму харчавання, каб ад першага да апошняга прыёму ежы прайшло не больш за 8 гадзін, а таксама да адсутнасці перакусаў паміж асноўнымі прыёмамі ежы (у тым ліку ноччу). Калі ўсё ж пачуццё голаду паміж асноўнымі прыёмамі ежы нарастае, а наступны яшчэ далёка, то прадукты для перакусу павінны ўтрымліваць невялікую колькасць бялку і валодаць нізкім глікемічным індэксам. Ідэальна для гэтага падыдуць арэхі або свежыя гародніна і караняплоды (сельдэрэй, морква, балгарскі перац і інш.).

Памылка 3. Хуткая ежа

Можна сказаць: занадта хуткае паглынанне ежы. А можна сказаць — няўважлівае да яе стаўленне. Сюды адносяцца і прыём ежы перад тэлевізарам або камп'ютарам, і «сядзенне ў тэлефоне» падчас трапезы — гэта непазбежна вядзе да пераядання. Вы ясце аўтаматычна і прапускаеце момант насычэння. Гэтак жа, як калі ясце на хаду. У спешцы не заўважаеце, што ясце — а ўжываеце звычайна тое, што аказваецца пад рукой. Тобок шкоднае і каларыйнае: глазураваныя сыркі, булкі і фастфуд. Але калі нават вы ясце правільныя прадукты, аднак паглынаеце ежу занадта хутка (а да нядаўняга часу ў нашай культуры ўменне хутка паесці заахвочвалася пачынаючы з дзіцячага садка), то зноў жа не паспяваеце заўважыць, калі наеліся.

— Сігнал аб насычэнні паступае ў мозг са спазненнем на 20 хвілін. Менавіта столькі — мінімальны час вашай трапезы. Калі ж у вас няма столькі часу на ежу, лепш устаць з-за стала, адчуваючы лёгкі голад. Хутчэй за ўсё, неўзабаве вы адчуеце, што з'елі якраз дастаткова.

Памылка 4. Няякасныя тлушчы

Такія тлушчы — пастаянны спадарожнік практычна кожнага сучаснага чалавека. Гаворка пра транстлушчы, а яны паступаюць у наш арганізм з фастфудам, выпечкай, чыпсамі, кандытарскімі вырабамі. Транстлушчы — гэта від тлушчаў, якія атрымліваюцца штучна, калі вадкі раслінны алей ператвараецца ў цвёрды. Паводле рэкамендацый медыкаў, паступленне ў арганізм транстлушчаў не павінна перавышаць 2-3 г у суткі. Калі паступае больш, развіваюцца сардэчна-сасудзістыя захворванні, павышаецца рызыка развіцця дыябету 2-га тыпу і вельмі моцна пакутуе імунітэт.

Памылка 5. Парушэнне пітнога рэжыму

Ці даўно вы пілі проста чыстую пітную ваду? Кава, чай, сок не лічацца! Сёння дыетолагі кажуць, што менавіта чыстая пітная вада — і найважнейшы імунамадулятар, і аснова нашага добрага самаадчування.

— Асноўныя правілы здаровага харчавання нескладаныя, — адзначае Наталля Белякова. — Прытрымлівацца пітнога рэжыму (1,5—2 л чыстай пітной вады ў дзень), звесці да мінімуму прадукты з транстлушчамі і хуткімі вуглявадамі, харчавацца рэгулярна, а есці ўмерана. Ну, і ўжываць правіла «здаровай талеркі» (1/4 талеркі павінны складаць бялкі, 1/4 — павольныя вугляводы, 1/2 — клятчатка (некрухмалістая гародніна).

Памылка 6. Недахоп клятчаткі

Яшчэ гадоў 20-25 таму (асабліва ў вёсках і маленькіх мястэчках) гародніна, акрамя бульбы, і асабліва травы лічыліся чымсьці несур'ёзным. Сёння ў сярэднестатыстычны рацыён нашых сугарадзян зеляніна ўваходзіць, але ўсё яшчэ ў недастатковай, з пункту гледжання дыетолагаў, колькасці. Як і гародніна (бульба не лічыцца). У выніку арганізм недаатрымлівае неабходныя яму клятчатку, вітаміны і мікраэлементы.

Памылка 7. Вядома ж, цукар!

Цукар сёння паўсюль — не толькі ў ласунках. Яго дастаткова ў соусах: гарчыцы, маянэзе, кетчупе, у паўфабрыкатах і нават у каўбасных вырабах. Вам здаецца, што вы амаль не ясце цукру — падумаеш, дазволілі сабе адно пірожнае з кавай? На самай справе сучасны чалавек ужывае цукру ў дзень значна больш, чым лічыць. Ну, а пра тое, што рафінаваны цукар — гэта белая смерць, не чытаў толькі лянівы.

— На залішняе спажыванне цукру ўплываюць таксама купля гатовай ежы і, як ні дзіўна, ужыванне абястлушчаных прадуктаў, — адзначае суразмоўніца. — Што датычыцца гатовых страў, то таксама нельга быць упэўненым, што ў іх няма непажаданых інгрэдыентаў. Лепш гатаваць ежу самастойна, тым больш што на гэта вы выдаткуеце калорыі. Ну, а калі казаць аб абястлушчаных прадуктах, то нізкае ўтрыманне тлушчу кампенсуецца ў іх вялікай колькасцю цукроў, якія арганізм чалавека трансфармуе ў тлушчы. Таму чытайце этыкетку і звяртайце ўвагу на колькасць не толькі тлушчаў, але і цукроў.

Памылка 8. Няправільнае гатаванне ежы

Смажанне — па-ранейшаму найбольш папулярны ў нашай краіне спосаб гатавання ежы, хоць наўрад ці хто-небудзь не ведае, што прадукты лепш варыць, гатаваць на пары або хоць бы запякаць у духоўцы. У працэсе смажання ідзе хімічны працэс, у выніку якога ўтвараюцца канчатковыя прадукты глікіравання (КПГ). Яны робяць смажаныя стравы апетытнымі, дзякуючы ім з'яўляецца смачная скарынка, яны надаюць мясу і агародніне той самы пах і смак. Яны ж парушаюць нармальны склад крыві: узрастае ўзровень САЭ, з'яўляецца рызыка атэрасклерозу сасудаў, інсульту і інфаркту.

— Любая працяглая тэрмічная апрацоўка ежы вядзе да павелічэння глікемічнага індэкса прадуктаў (паказчыка ўплыву вугляводаў у прадуктах харчавання на змяненне ўзроўню глюкозы ў крыві), зніжэння ўтрымання фітанутрыентаў, вітамінаў, мінералаў, амінакіслот. Таму найбольш прымальным лічыцца ўжыванне ў ежу прадуктаў, даведзеных да стану al dente, а таксама прыгатаваных у зберагальных рэжымах.

Памылка 9. Нездаровая вячэра (якую лепш аддаць ворагу)

Няправільная вячэра — самая тыповая памылка нашага чалавека. Мы гаворым не пра тых, хто абыходзіцца без сняданку, «абедае» кубачкам кавы, а на вячэру вырашае ўзнагародзіць сябе за цэлы дзень. Такіх людзей сёння становіцца менш. Але нават тыя, хто перакананы, што вячэраюць правільна, нярэдка памыляюцца.

— Першая памылка датычыцца бялку, — кажа дыетолаг. — Мяса і мясныя вырабы, а таксама тлустую рыбу лепш уключаць у рацыён на сняданак і абед, калі неабходна спажыць найбольшую колькасць энергіі, каб яна павольна расходавалася на працягу дня. У вячэрні прыём ежы бялкі лепш атрымаць за кошт нятлустых гатункаў рыбы, а таксама раслінных бялкоў, тварагу. Яшчэ адна памылка, звязаная з вячэрнім рацыёнам, — выбар садавіны. Пры ўжыванні садавіны лепш арыентавацца на яе глікемічны індэкс. Такія табліцы можна ўзяць у інтэрнэце. Садавіну з больш высокім індэксам лепш ужываць перад плануемай фізічнай нагрузкай, а не на ноч. Яшчэ адна памылка — уключэнне ў рацыён хлебабулачных вырабаў. Калі спажываць іх на ноч нават у невялікай колькасці, хуткія вугляводы непазбежна ператворацца ў тлушч.

Памылка 10. «Буду есці як прывык»

Сёння аб здаровым рацыёне клапоцяцца многія, але ёсць вялікая катэгорыя людзей, у якіх словазлучэнне «правільнае харчаванне» выклікае нуду і зубны боль. І гэта неабавязкова пажылыя людзі «старой загартоўкі» — ёсць і прадстаўнікі сярэдняга ўзросту, і моладзь.

— Існуе стэрэатып, што правільнае харчаванне — гэта дорага. Але кошт рацыёну адыгрывае не настолькі важную ролю, як можа здацца на першы погляд, — адзначае Наталля Белякова. — Практычна з любых прадуктаў і на любы бюджэт можна скласці як здаровае, так і шкоднае меню. Яшчэ адзін стэрэатып: правільнае харчаванне — гэта нясмачна і прэсна. І гэта таксама не так. Здаровая ежа можа быць смачнай і разнастайнай.

Так што далоў стэрэатыпы! Бо здароўе не толькі зробіць ваша жыццё больш камфортным, але і сэканоміць значныя сродкі, якія не прыйдзецца марнаваць на лячэнне.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Будзь у курсе!

ЦЯГНІКОЎ ПАМІЖ КРАІНАМІ СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ

Беларуская чыгунка ва ўзаемадзеянні з ААТ «Расійскія чыгункі» і згодна з рашэннямі аператыўнага штаба па папярэджанні завозу і распаўсюджвання новай каранавіруснай інфекцыі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі працягвае паэтапнае аднаўленне міжнародных пасажырскіх зносін паміж краінамі.

Так, з 10 чэрвеня аднаўляецца курсіраванне цягніка № 39/40 Полацк — Масква фарміравання Беларускай чыгункі адпраўленнем з Полацка ў 18.30 і прыбыццём у Маскву ў 5.43. З Масквы цягнік будзе адпраўляцца з 11 чэрвеня ў 23.37 і прыбываць у Полацк у 10.30. Састаў будзе курсіраваць штодня.

Таксама цягнік № 302/301 Мінск / Гомель — Адлер фарміравання Беларускай чыгункі на летні перыяд з 11 чэрвеня да 11 верасня павялічвае перыядычнасць курсіравання. Састаў адпраўленнем з Мінска з 11 чэрвеня, а з Адлера з 13 чэрвеня, будзе курсіраваць праз дзень.

Праезд названымі цягнікамі прадугледжаны толькі для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Беларуская чыгунка будзе аператыўна інфармаваць аб аднаўленні курсіравання іншых пасажырскіх цягнікоў у міжнародных зносінах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Маладыя і ініцыятыўныя

«РАЗУМНАЯ ДАРОГА» І МАЛЮСКІ ДЛЯ БІЯТЭСЦІРАВАННЯ

У БДУ падвялі вынікі Міжнароднага маладзёжнага конкурсу стартапаў Startup Heart

Перамог праект «Разумная дарога» студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. Ініцыятыва вырашае праблему эканоміі электраэнергіі на дарогах. Спецыяльныя датчыкі на ліхтарах аўтастрады фіксуюць рух транспарту і вызначаюць ступень патрэбы і інтэнсіўнасці асвятлення ўчастка.

Прыз глядацкіх сімпатый дастаўся праекту «Прэснаводныя малюскі» каманды Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Студэнты прапануюць у якасці доследных узораў выкарыстоўваць для біятэсціравання прэснаводных малюскаў. Гэта дазволіць зрабіць больш танны этап даклінічных даследаванняў лекавых прэпаратаў.

Высокую ацэнку журы атрымаў стартап U-study эканамічнага факультэта БДУ па стварэнні адукацыйнага цэнтра для школьнікаў з выкладчыкамі-студэнтамі. Навучальны працэс будзе ўключаць падрыхтоўку па школьнай і дадатковай праграмах, а таксама работу на трэнажорах па тэматыцы розных дысцыплін.

Фінал конкурсу прайшоў у вочна-дыстанцыйным фармаце. Усяго была прадстаўлена 21 ініцыятыва ў галіне мабільных, сацыяльных і адукацыйных праграм, медыцынскіх тэхналогій і іншыя.

Арганізатарам конкурсу выступіў эканамічны факультэт Белдзяржуніверсітэта.

Startup Heart — адукацыйны конкурс стартапаў для моладзі. Ініцыятыва і рэалізацыя належаць студэнтам і выкладчыкам БДУ. Першы сезон стартаваў у маі 2019 года і прыцягнуў больш як чатыры дзясяткі праектаў. Сёлета конкурс аб'яднаў удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Германіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРА «ЗАЛАТЫЯ ЛАХМАНЫ» І ЗНІКЛЫЯ ВЕРШЫ

Дачка памерлага ў высылцы паэта Жылкі выпрошвала ў крытыка Бэндэ вершы бацькі

І зноў перад намі — пажаўцелыя аркушы архіўных сховаў... Почыркі людзей, якіх даўно няма ў жывых... Праўкі, выкрэсліванні — па якіх можна разгадаць ход думак... І дыханне страшнай эпохі па-за радкамі. Фонд крытыка Лукаша Бэндэ з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва працягвае адкрываць свае таямніцы.

Уладзімір Жылка і Язэп Пушча.

Лісты ад Беатрычэ

Нагадаю, што ў фондзе шмат матэрыялаў рэпрэсіраваных літаратараў, да лёсу якіх Бэндэ часта меў сумнае дачыненне. Ён збіраў рукапісы загубленых ім і яго калегамі людзей, а калі пачалася эпоха рэабілітансу, гэтыя дакументы ў яго можна было выкупіць...

Вось перад намі аркушык са школьнага сшытка, спісаны выразным почыркам.

«Дорогой Лука Афанасьевич!

На днях я посетила Минск. Заходила в Союз писателей Белоруссии. Вот там П. Бровка и познакомил меня с вашим адресом. Он мне сказал, что вы, Лука Афанасьевич, в своем сбережении имеете книги и моего папы, Владимира Адамовича Жилко (У. А. Жылки) (тут і далей — арфаграфія арыгінала. — **Л. Р.**). *Я очень Вас прошу сообщить мне, сможете ли Вы их хотя на время переслать мне. Папа теперь реабилитирован, а у меня нет ничего, ведь мне было три года, когда умер папа, а то, что хранила бабушка (мать папы), войной пропало.*

Дорогой Лука Афанасьевич! Вы уж не откажите мою просьбу. Сама приехать к Вам я не смогу. Имею двое детей, маленькому только годик. Муж лёг в больницу. Все, что это будет стоить, я вышлю деньги. Только уж не откажите, если они у Вас есть, особенно последний его сборничек «З палёў Заходняй Беларусі».

С уважением и большой просьбой к Вам —

Наталья Жилко.

15/VII 61 г.»

Ліст адпраўлены са станцыі «Палата» Полацкага раёна, у якасці дома згадана Казіміраўская сярэдняя школа — трэба разумець, аўтарка ліста там працавала.

А цяпер неабходныя тлумачэнні...

Бацька Наталлі, Уладзімір Жылка, выдатны беларускі паэт, прыехаў у БССР у 1926 годзе з Прагі, куды ў свой час трапіў на вучобу ва ўніверсітэт. Запрасілі яго на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу, а той вырашыў застацца — каб удзельнічаць у культурным жыцці Радзімы... Яго арыштавалі 19 ліпеня 1930 г., нягледзячы на тое, што быў сухотны, ляжаў з высокай тэмпературай. Асудзілі на высылку ва Уржум. Незадоўга да гэтых падзей Жылка ажаніўся — са студэнткай музычнага тэхнікума, дзе выкладаў літаратуру, Рымай Маневіч. Нованароджаную дачку назвалі Беатрычэ. Жылка быў шчаслівы, песціў сваю Атачку, сачыняў для яе вершыкі... У высылку да мужа Рыма прыехала, але заставацца не збіралася. Яе паводзіны, пакуль муж ляжаў па бальніцах, выклікалі абурэнне іншых высланых... Карацей, хворага Жылку Рыма кінула і з'ехала. Паэт памёр, трымаючы пры сабе пасмачку валасоў дачкі, перавязаную стужкай, і яе браззготку.

Беатрычэ выхоўвала бабуля, маці Уладзіміра Жылкі. Імя дзяўчынкі змянілі на больш звыклае — Наталля.

І вось яна, ужо дарослая жанчына, спрабуе знайсці хоць штосьці з бацькавай творчай спадчыны. Як бачыце, да Бэндэ яе скіраваў старшыня Саюза пісьменнікаў Броўка — то-бок пра бэндэўскія сховы рэпрэсіраванай літаратуры было шырока вядома. Што датычыцца згаданага зборніка «З палёў Заходняй Беларусі», ён выйшаў у 1927 годзе і выклікаў вялікія спрэчкі — кажуць, фактычна стаў прычынай расколу паміж тымі беларускімі літаратарамі, хто арыентаваўся, як Жылка, на сусветную класіку і творчыя пошукі, і тымі, хто ставіў ідэалогію вышэй за мастацкую вартасць. Жылка тады развітаўся з «Маладняком» і перайшоў ва «Узвышша».

Што адказаў Бэндэ Наталлі-Беатрычэ, не ведаю, бо ліста ў фондзе няма, затое ёсць наступны ліст Наталлі.

«Дорогой Лука Афанасьевич!

Прошел почти месяц с тех пор, когда я получила Ваше письмо, за которое очень сердечно Вам благодарю. Тогда же я сразу написала Язепу Пущу, но вот только вчера получила от них письмо, которое писала его жена. Иосиф Павлович очень сильно болеет, находится в одной из больниц Минска.

Дорогой Лука Афанасьевич! Я Вас очень прошу, чтобы Вы выслали мне всё то, что у Вас есть из написанного отцом. Я вам обязательно всё возвращу. Ведь только немногое и лучшее будет выбрано для печати.

Лука Афанасьевич! Я очень Вас прошу не отказать в моей просьбе. Всё, что Вы пришлёте, я перепишу, а книги отошлю Вам обратно.

Наша ст. Полота, Лука Афанасьевич, ведь на дороге из Ленинграда в Полоцк-Минск. Может когда-нибудь будете свободны, то приезжайте к нам со своей семьёй. У нас летом часто отдыхают ленинградские. Рядом озеро, лес.

Мы построили свой домик. Я уже здесь живу семь лет после того, когда приехала из Минска, где окончила педагогический институт им. Горького.

Еще раз прошу не откажите мою просьбу».

Язэп Пушча, ён жа Іосіф Плашчынскі, да якога паслаў Наталлю Бэндэ, — таксама рэпрэсіраваны паэт... Толькі яму пашанцавала больш, чым Жылку: жонка Стася не адраклася ад мужа — наадварот... У вязніцу да яго хадзіла за дзясяткі кіламетраў, у высылку паехала і засталася... Але наўрад ці ў Пушчы маглі захавацца рукапісы Жылкі, калі ўласныя пазнікалі падчас ператрусаў.

Працытуем трэці ліст ад Наталлі Жылкі:

«Дорогой Лука Афанасьевич!

Очень большое спасибо за письмо, которое получила 20 октября. Ответить вовремя не пришлось. Три недели находилась в больнице с двухлетним сыном (двустороннее воспаление). Теперь дома, чувствует хорошо, но ведь надо его беречь. Получила письмо с Минска. Иосиф Павлович еще в больнице. Он очень долго летом находился дома, его лечил врач из Союза писателей. Потом он посоветовал, чтобы Иосиф Павлович выехал на дачу, на свежий воздух. Вот он и поехал. Через неделю Станислава Эдуардовна отвезла его в больницу в очень тяжелом состоянии. Оказывается, вместе с сердцем непорядки есть и в лёгких. Теперь он чувствует себя лучше, врачи хорошие, обещают к Новому году выписать. Относительно отца: летом я была в Минске, говорила с П.У. Бровком. Он просил собрать все написанное отцом, а они уж сами выберут лучшее. А у меня ведь очень мало что есть, четыре стихотворения да несколько перекладов. Иосиф Павлович имеет несколько стихотворений из книжечки «На ростані». Лука Афанасьевич! До Нового года Вы уж видимо не сможете быть в Ленинграде. Я Вас очень попрошу, если сможете, то сообщите мне, когда вы сможете только быть дома, то может бы к Вам заехал мой дядя (брат отца). Он живет в Слуцке, Минской обл. Три года назад ему сделали очень тяжелую операцию, вырезали часть прямой кишки. Правда, теперь он уже немного лучше чувствует, но не работает, получает пенсию. С издательства мне ответили, что им нужно все предоставить, а они уже еще пересмотрят. Общем, я Вас, Лука Афанасьевич, очень, очень прошу помочь в этом вопросе. Да, мне хочется спросить, хотя может это и не скромно, может Вы, Лука Афанасьевич, были знакомы с моими родителями? Ведь после того, как в 1931 г. отца взяли, мать берет с ним развод... Меня выгодовала бабушка, мать отца. Матери я не помню. Есть слухи, что до 1941 года она жила в Ленинграде».

Пад пісьмом дата — 17 лістапада 1961 года.

Што ж, Бэндэ быў знаёмы з усімі літаратарамі... Хваліўся, што «объекты моей критики были «изъяты» НКВД».

Наталля-Беатрычэ выгадавалася вернай памяці бацькі. Разам з дзядзькам Барысам пісала ва ўсе інстанцыі, да ўсіх, хто мог дапамагчы са зборам матэрыялаў. Ці ўдалося штосьці выкупіць у Бэндэ? Паколькі 23 снежня 1961 года Лукаш Бэндэ памёр, відаць, нічога Наталля Уладзіміраўна ў яго не дапрасілася.

Наступны зборнік Жылкі выйшаў толькі ў 1970 годзе.

На магіле Наталлі Жылкі-Лазаравай у Палаце выбіты радок з верша яе бацькі: «У маім маленні адзіная ты».

Крытыка з падтэкстам

20 сакавіка 1960 года ў Маскву, у Дзяржаўнае літаратурнае выдавецтва адпраўляецца ліст рэдактара ленінградскага аддзялення выдавецтва Лукаша Бэндэ.

«11 января этого года Михаил Тихонович Лыньков прислал в отделение расклейку переводов своих рассказов для сборника, который выйдет в серии советской прозы».

Асаблівыя нараканні ў Бэндэ выклікала якасць перакладаў, зробленых Паўлам Кабзарэўскім.

«Переводчик, с моей точки зрения, плохо чувствует русский язык, недостаточно знаком с грамматикой. Он допускает формы и обороты не свойственные русскому языку... Кобзаревский, например, не знает, что БУКСА женского рода и относится к первому склонению. А это значит, что множественное число в родительном падеже будет БУКС, а не БУКСОВ, как он написал. У него ШТАНЫ не надевают, а одевают... Ехать медленно и мчаться по Кобзаревскому одно и то же: «Медленно мчиться машина»... «На промерзшей льдинке» можно «бешено нестись по крутому откосу». Мех гармошки можно «разбить в щепки». Он совершенно не чувствует различия в словах «хлопает рукой по воде» и словами «ударяет (следовало бы — бьет) рукой по воде», «плещет(?) рукой» по воде; а слова «блестит» и «сверкает» у него одно и то же. Он может позволить себе даже такой оборот: «Усядется (птица) отдохнуть на белом камне дедовой могилы и напряженно спархивает со своей ношей, тяжело трепещет крыльями, поднимаясь вверх к дубовой вершине». Таких «дубовых» оборотов немало в переводах Кобзаревского».

Бэндэ вінаваціць перакладчыка і ў тым, што той і беларускай мовы не ведае, і таму скажае аўтарскі тэкст.

«У автора: «аж гнуліся гэтыя трапяткія асіны, абганяючы ў віратлівым разбезе белыя воблакі, падмятаючы іх; разрываючы на празрыстыя пасмы і кудзеркі». У Кобзаревского: «Даже гнулись эти трепещущие осины, обгоняя в своем стремительном разбеге белые облака, подметая их, разрывая на прозрачные полосы». У Лынькова: «Унізу маўчалі. Цікавалі дзяўчаты, ды каторыя хлопцы свае хітравата падміргвалі». У Кобзаревского: «Внизу молчали. Внимательно слушали только девушки и некоторые из своих ребят хитровато подмигивали». Здесь грубое искажение текста. У Лынькова: «Адзаду пялась не адстаць «санітарка». У Кобзаревского: «Сзади плелась «санитарка». У Лынькова: «перажагнаць свой васпаваты твар», у Кобзаревского «скривить свое рябое лицо».

Прыкладаў вельмі шмат, частка з іх, вядома, слушная — дзіўна перакладаць «пад зрэбнай сарочкай» как «под грязной рубашкой». А частка не вельмі перакананаўчая — «цярушацца зоры» і «сыплются звезды», «вядро бразнула» — «ведро грохнуло», «залатыя лахманы» і «золотые лохмотья», у прынцыпе, супастаўна.

«Расклейка переводов Кобзаревского испещрена моим карандашом. Думаю, что это особенно не помешает чтению».

І цікавая прыпіска:

«Данное письмо прошу рассматривать как личное письмо Бендэ, но не редактора отделения. Я не согласовывал его текст с руководством, но секрета в том, о чем пишется в нем, конечно, нет».

Чаму ж Лука Апанасавіч так уз'еўся менавіта на перакладчыка Кабзарэўскага?

Каб зразумець падтэкст, трэба ведаць пра пэўныя падзеі, пра іх я пісала ў артыкуле «Таямніцы фонду Бэндэ» («Звязда», 21 красавіка, 2021).

За некалькі гадоў да напісання гэтага ліста Бэндэ змагаўся за права перакласці раман свайго рэпрэсіраванага колішняга сябра, Платона Галавача. Але яму забараніла гэта рабіць удава Галавача, Ніна Фёдараўна. Як скардзіўся Бэндэ, яна *«возражает против поручения мне перевода романа «Праз гады» на том основании, что я 1) не знаю белорусского языка, 2) третировал Головача как писателя и коммуниста»*. Патрабаванне Ніны Галавач падтрымаў лістом у Дзяржлітвыдат Саюз пісьменнікаў БССР.

Бэндэ ўчыніў сапраўдную вайну, паграмаў судом за паклёп, але раман Галавача ў яго перакладзе так і не ўбачыў свет. Затое ў 1960-м выйшаў пераклад гэтага рамана, зроблены Паўлам Кабзарэўскім. Так што Кабзарэўскі сур'ёзна перайшоў дарогу Бэндэ.

Павел Кабзарэўскі, у сапраўднасці — Гардон Фавій Залманавіч, жыў у Ленінградзе і лічыўся слынным перакладчыкам з беларускай — яго з удзячнасцю ўспаміналі многія нашы класікі, ён быў асабіста знаёмы з Янкам Купалам, пра якога пакінуў успаміны. Барадулін успамінаў, як Кабзарэўскі прывёз яму з Ленінграда фотакартку Ганны Ахматавай «уласнага здымання». Літаратуразнаўцы лічаць пераклады Кабзарэўскага найбольш дакладнымі і адпаведнымі аўтарскім задумам, як бы Бэндэ іх ні бэсцюў.

Звярніце ўвагу, як Бэндэ злasліва абвінавачвае «шчаслівага сапернiка» ў няведанні беларускай мовы, як яго самога вінавацілі Ніна Галавач і Саюз пісьменнікаў, і спрабуе гэта давесці на прыкладах.

І гэта далёка не ўсе гісторыі, якія можа распавесці фонд Лукаша Бэндэ ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

САЛДАТАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА...

Як пісалі гумарысты, машына не раскоша... А цяпер і пагатоў... На ёй (дакладней, вядома ж, на іх...) хто толькі не ездзіць!

Алена, мая таварышка, здала на правы ў сталым узросце — незадоўга да пенсіі. Яна б, можа, і раней... Муж не дазваляў. Казаў: «Адно і тое ж — што жанчына за рулём, што малпа з гранатай», нават прыклад таму прыводзіў — жонкі свайго дружбака. Тая неяк паруліць захацела. Муж дазволіў: ну чаму б і не, калі просіць — па роўнай грунтоўцы, пад яго наглядам...

Карацей — усё добра было б, калі б на дарогу не выпаўз... вуж: вялізны такі, бліскучы. Кіроўца ўбачыла і...

Дзіцячая рэакцыя (ці дзявочая?): крык, піск, ногі з педаляў, рукі з руля...

Шчасце, што муж яго перахапіў!

...Але ж і яны, тыя мужы, за рулём далёка не анёлы: у іх таксама прыгоды бываюць. Аленін вось неяк расслабіўся пад добры шансон — педаль газу моцна прыдушыў, трапіў у ДТЗ, пазбавіўся правоў. А без іх ды машыны ж, як без рук, да таго ж з непрывычкі...

Так што нідзе не дзеўся бядак: жонцы, што называецца, «ласку зрабіў» — дазволіў пайсці на курсы.

...Лена там самая старэйшая была (астатнія — ва ўзросце ўнукаў), аднак Дзімона, інструктара па ваджэнні, яе ўзрост чамусьці не бянтэжыў (ва ўсякім разе спачатку)... Гэта потым хапіла ўсяго. Іх машына чамусьці глухла часцяком (пераважна на скрыжаваннях), яна ж час ад часу любіла палохаць фуры — выязджаць на сустрэчную паласу альбо «рассякаць» па двайной суцэльнай...

А неяк на павароце Алена не збавіла хуткасць, і машына ледзь не нырнула ў абрыў. Вось тады ўжо Дзімон, які дагэтуль нервова курыў у фортку, сказаў, што яму да пенсіі — не тое, што некаторым, і ён хацеў бы дажыць...

Як бы там ні было — вочы баяцца, а рукі робяць...

І дарогу таксама адольвае той, хто ідзе. Альбо ездзіць.

Экзамены — і па тэорыі, і па ваджэнні — Алена здала паспяхова, атрымала правы, раз'язджае сама, часам падвозіць мужа. І той (па чутках) нават рады ўжо, ганарыцца перад сябрамі, Лену, здараецца, Шумахерам заве.

Не за прыгожыя ж вочкі?

Таццяна Раманава,

г. Наваполацк.

ЭСТАФЕТА ДАБРЫНІ,

альбо «Міхалыч, будзь чалавекам...»

Сталым чытачам нагадваць не варта: былі часы, калі партыя казала: «Трэба», камсамол адгукаўся: «Ёсць!».

Такім чынам, па яго пуцёўцы наша сяброўка Ліля ад'язджала на цаліну. Мы з Нінай пайшлі на вакзал, каб яе праводзіць. Прычым не проста там аркестр паслухаць ды рукамі памахаць, — разам з Ліляй зайсці ў вагон, хоць трохі праехаць, а потым вярнуцца назад...

Мы «добра» прыдумалі. І ўсё, можа, так і было б: Ліля з Нінай пайшлі займаць месцы... Мне ж карцела купіць марозіва, для ўсіх. А я куляй, як быццам, панеслася ў буфет, а калі вярнулася, цягніка ўжо і след прастыў.

Шчыра: у мяне тады столькі гора было, столькі слёз... Далібог, не меней, чым у Ніны прыгод!

«Значыць, зайшлі мы ў вагон, паселі, — расказвала потым яна. — Поезд, чуем, крануўся. Мы едзем, ва ўсе вочы глядзім у акно. Бачым, што праехалі Мядзведку і Асінаўку... Там цягнік чамусьці не спыніўся, а прамой наводкай, як той казаў, панёсся далей — аж да самай... Оршы (ад Віцебска гэта 90 км).

Туды мы прыбываем а палове дзясятай раніцы. Я выходжу з вагона, кірую да кас, каб паехаць назад, і бачу, што цягнік у мой Віцебск адпраўляецца толькі... позна ўвечары, што білет каштуе амаль дзесяць рублёў (шчасце, што яны ў кішэні — мама дала), але ж мне цэлы дзень трэба нечым займацца і нешта есці...

Гуляю да помніка Заслонаву і далей... Бачу, што лавачак шмат... А ўжо колькі пахаў... Там піражкі прадаюць, там — булачкі, там — какаву... І ўсё не для мяне!

Але ж голад не цётка — здаюся: за 50 капеек бяру сабе булачку. А білет пасля — толькі да Мядзведкі: ну не з'явяцца ж кантралёры пасля гэтай станцыі, на пад'ездзе да Віцебска?!

Марна было спадзявацца: не паспела ўзрадавацца, што амаль даехала, як яны, тыя грозныя дзядзькі, зайшлі ў цягнік. Я тут жа сіганула на верхнюю паліцу і прытварылася, што моцна сплю...

Дзядзькі пабудзілі — папрасілі паказаць білет. Я праціраю «заспаныя» вочы, корпаюся ў сумачцы, дастаю:

— Дык у вас жа толькі да Мядзведкі, — кажа адзін з кантралёраў. — А яна ўжо ззаду... Ты, дзеванька, што — праспала?

— Як?! — «панікую». — Што ж мне рабіць? Ні капейкі грошай...

— Добра, — уздыхае старэйшы з дзядзькоў, — едзь да Віцебска. Адтуль да тваёй Мядзведкі таварняк хутка пойдзе. Я свайму чалавечку запіску напішу.

Кантралёр і праўда дастае якісьці лісток, выводзіць на ім: «Міхалыч, будзь чалавекам, пасадзі гэтае дзяўчо на таварняк да Мядзведкі. Мікола».

Ну і далей тлумачыць, куды з гэтай запіскай пайсці, каму аддаць... А мне ж ужо не трэба было...»

Такім вось чынам Ніна дабралася да Віцебска, дзе яе зачакаліся знерваваная мама, радня, сяброўкі...

Але ж кропку ў гэтай гісторыі ставіць рана, бо праз нейкі час і на тым жа вакзале ў адказ на дзіцячае «Хачу булачку... Дзеда, купі...» Ніна пачула старэчае «Не, дзіцятка... У нас грошай няма», і тут жа ўспомніла сябе: падбегла да прадавачкі, набрала вафель, булачак, кексаў, напітку, аддала той унучцы з дзедам...

А потым дома выцягнула з кніжкі пажоўклы лісток, яшчэ раз прачытала: «Міхалыч, будзь чалавекам...» і падумала, што гэта ж зусім нескладана, няцяжка — быць...

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

АДКЛАД НЕ ІДЗЕ Ў ЛАД

...Супрацоўніца расказала, як некалі яе маці зварыла варэнне, дала ім з братам пакаштаваць, а ўсё астатняе, у трохлітровым слоіку, схавала на зіму.

Дзеці «знайшлі» раней (нават на гарышчы), адкрылі слоік, наеліся самі, паклікалі сяброў, а каб «схаваць канцы», налілі ў слоік вады.

Варэнне, вядома ж, забрадзіла. Маці падумала, што сама вінаватая (мала цукру дадала) і пусціла прадукт на гарэлку...

Трохі падобная гісторыя была і ў нас.

...Тады, у канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, за працу ў калгасе ўжо сталі нешта плаціць, і калі бацькі трымалі гаспадарку ды ўдваіх працавалі, а дзяцей было не сямёра, то нядрэнна і жылі.

Нас мама гадавала адна, і мы з сястрой толькі потым, у сталым узросце, змаглі ўявіць, як жа яна гаравала! Часта недаядаючы і недасыпаючы, мама ўвесь час клапацілася, думала пра нас: каб хоць адзеліся і абуліся, каб мелі ўсё для вучобы, каб у нас, як у іншых дзяцей, і па ровары было, і па лыжах... Ну і на стале — каб мяса, каб масла, каб свая гародніна-садавіна... Добра, што тата (ён рана памёр) вялікі сад нам пакінуў — з яблынямі, грушамі, вішнямі...

У той год на дзіва ўрадзілі слівы! Гэта падзея першая. Другая — у госці да нас прыехала маміна сястра, наша любімая цётачка Таня. А трэцяя — яна сказала, што будзе «ставіць кампот»: шмат, у трохлітровых слоіках. А мы потым — увосень, зіму ці вясну — будзем адкрываць і піць...

Такога цуду ў нашай вёсцы яшчэ не было! Мы з сястрой, глытаючы слінкі (салодкага, цукру хацелі заўжды), досыць доўга адсочвалі працэс прыгатавання, а потым, калі госця паехала, упрасілі матулю адкрыць хоць адзін трохлітровік...

Якая ж там была смаката! Проста зроду такой не елі! Ад слоіка адарвацца не маглі!

Але ж мама прывучала нас да ашчаднасці, таму я, старэйшая, сказала, што кампот трэба расцягнуць на некалькі дзён, а на разе, каб спакусы не было, засунуць яго... пад ложак. Такім чынам, свята жывата атрымалася ў нас і назаўтра.

На трэці дзень кампот не здаваўся ўжо такой смакатой. А на чацвёрты мы і зусім адвярнулі насы... Праўда, маме прызнацца ў гэтым ну ніяк не маглі...

Выкінуць слівы курам ці свінням — таксама не выпадала, бо раптам застануцца костачкі і па іх мама ўсё зразумее.

Факт, што слоік з рэшткамі кампоту і сліў мы з жалем занеслі пад дзедаву іграшу і вылілі.

Потым дзён колькі яшчэ бегалі глядзець, што з яго засталося.

...Не паверыце: горка прыгожых слівавых костачак аж да сёння ў мяне ў вачах — разам з сорамам перад мамай і цётачкай Таняй, разам са шкадобай, што такі прадукт аддалі мурашам, не змаглі з'есці самі, не хапіла розуму.

Таццяна Новік,

г. Клецк.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ЦВІК З РОДНАГА ДОМА

Што трэба ведаць пра спадчыну і адказнасць

СЁЛЕТА нам пашанцавала з нечаканым набыткам. Сяброўка пачала рабіць рамонт у кватэры нядаўна памерлай бабулі і вырашыла пазбавіцца ад старой мэблі і дываноў. Аддавала, лічы, дарма — за самавываз. Адмаўляцца грэх было — у вясковай хаце зусім старыя шафы: і для адзення, і кніжная, і сервант. Куплялі іх бацькі ў пачатку 1960-х гадоў, як толькі пачалі станавіцца на ногі, у растэрміноўку. Калісьці мэбля была дыхтоўная і прыгожая, паліраваная, як тады модна было. Але дзесяцігоддзі карыстання, а яшчэ больш — холад і вільгаць, якія пануюць у хаце ўзімку ўжо пятнаццаць гадоў, бо ніхто тут не жыве, зрабілі сваю справу. Калісьці блішчучыя дзверцы сталі цьмяныя, з пралысінамі цвілі, якую не ўдавалася вывесці за лета. Нават люстры ў серванце ад старасці пакрыліся чорнай «пацінай». Карацей, калі засвяціла перспектыва займець даволі прыстойную секцыю сярэдзіны 1990-х ды яшчэ трых вялікія мяккія амаль новыя дываны на падлогу ўсяго за дзвесце пяцьдзясят рублёў (столькі каштавала перавезці з пагрузкай-разгрузкай усё гэта багацце з горада ў вёску), я адразу пагадзілася.

А потым... ці то засумнявалася, ці то засумавала. Прыехаўшы ў родную хату, доўга хадзіла па пакоях, гладзіла старую парэпаную мэблю, нібы развітваючыся з блізкім чалавекам. Вось у серванце пластыкавая белая ручка на дзверцах прыклееная карычневым клеем. А вакол — белыя разводы. Гэта я ў першым класе нейкім неверагодным чынам яе адламала і спрабавала прыклеіць сілікатным клеем. Які, вядома ж, ніяк не дапамог, толькі пакінуў плямы на цёмнай паліроўцы, а ручка так і засталася боўтацца на адным мацаванні. Ад заслужанага прачуханца ад бацькоў мяне тады выратаваў старэйшы брат, які якраз прыехаў з Мінска. У ягонай сумцы аказаўся цуда-клей з чароўнай назвай «Фенікс» — вельмі і доўгі час смярдзючы. Мы прыляпілі ім тую няшчасную ручку, а потым, калі старэйшыя заходзілі ў пакой і пыталіся, чым гэта так смярдзіць, мы рабілі няўцямныя твары, паціскалі плячыма, па-змоўніцку пераглядваліся. Пасля, зразумела, усё раскрылася, але з гэтай нашай змовы ўсе толькі па-добраму пасмяяліся...

А на старым шыфаньеры, пэўна, тым жа сілікатным клеем прымацаваная папяровая выява прыбранай дзяўчынкі, праўда, ужо без адной нагі. Ніхто і не здагадаецца сёння, што гэта Алёнка з шакаладкі. У поўны рост, ні каліва не падобная на сучасную. Алёнцы з шафы — дакладна больш за сорак. Кожны, хто прыязджаў да нас у госці, лічыў сваім абавязкам прывезці Алёнцы (мне, значыць) менавіта «Алёнку». Госці былі з розных куткоў вялікай краіны, і «Алёнкі» былі абсалютна розныя. Мы з мамай акуратна іх выразалі і наклейвалі... усюды, дзе нам падабалася. Гэту, што захавалася на шафе, здаецца, прывёз з украінскага Днепрапятроўска дзядзька Валодзя, мамін брат...

Я добра памятаю, як бацькі прынеслі з крамы ў суседняй вёсцы вялізны цяжкі дыван. Яны цягнулі яго ў руках тры кіламетры, але ў хату зайшлі з радаснымі ўсмешкамі. Разгарнулі ў зале — і ён заняў усю падлогу. А мы, малыя, кінуліся радасна качацца па гэтым яркім чырвона-жоўтым дзіве (а яно ў вясковай хаце пачатку 1980-х гадоў сапраўды было дзівам). Што цікава — колеры на тым паласы амаль не палінялі, хоць ён і заплямлены, і зашмальцаваны — вядома, столькі ног па ім за гады прайшлося...

Зусімі гэтымі ўспамінамі, разам з якімі са мной па бацькоўскай хаце хадзілі нябачныя цені дарагіх людзей, якіх ужо няма, я ўжо амаль перадумала штосьці мяняць, бо гэта здавалася амаль здрадай у адносінах і да гэтых людзей, і да ўласнага дзяцінства. Але пасля разважыла інакш. Гэта проста жыццё, і яно проста працягваецца. Пэўна, падобную настальгію адчувае кожнае пакаленне спадчыннікаў. Але ж разам са спадчынай і ўспамінамі мы атрымліваем яшчэ і адказнасць за гэтую самую спадчыну, за яе догляд, за яе захаванне. Што было б, калі б наш бацька, які нарадзіўся і вырас у гэтай хаце, марнаваўся маімі сумненнямі? У ёй бы дзесяцігоддзямі стаяў стары драўляны ложак і паточаны шашалем куфар, бо гэта нагадвала яму маленства?..

На наступныя выхадныя мы рабілі перастаноўку. Заўзята парадкавалі ў новых прыгожых шафах кніжкі, якія чытала не адно пакаленне, вясёлкавыя ад часу хрустальныя келіхі побач з новым сервізам, адзенне і абутак усіх памераў (летам у нас збіраецца вялікая сям'я). Малеча радасна качалася і скакала па чыстых мяккіх дываны...

АДЗІНАЕ, што я не дала вынесці з хаты, — старую радыёлу «Рыгонда». Такую нярэдка можна ўбачыць у сучасных фільмах пра савецкія часы. Памятаеце, такая з масіўнымі белымі «вачыма», адным з якіх рэгуляваўся гук, а другім лавіліся хвалі на прыёмніку, з прыладжаным унізе дынамікам, абцягнутым жаўтаватым палатном. Яна ўжо даўно не працуе, дый наўрад ці калі ўдасца знайсці на замену перагарэлыя ў ёй лямпы. Атрымаўся проста прадмет інтэр'еру, па сумяшчальніцтве — невялікі столік. Але кружэлкі ад яе мы таксама чамусьці пакінулі. Сярод іх я са здзіўленнем знайшла тую, што асабліва любіла слухаць у дзяцінстве, — «Цвік з роднага дома». Шведскую казку пра хлопчыка Свэнда, якому, куды б ён ні пайшоў і што б ён ні рабіў, гэты самы цвік, які ўзяў з сабой са сцяны роднай хаты, заўсёды дапамагаў жыць і заставацца самім сабой... Мне не ўдасца ўжо яе паслухаць, але яна, як і ўсё астатняе, заўсёды будзе са мной, будзе часткай мяне. І гэта, напэўна, галоўнае, што трэба ведаць пра спадчыну і адказнасць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 6 июля 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	**Помещение площадью** 12,7 кв. м в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D–213112, помещение на 6-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2	**53,66**	5,37
2	**Помещение площадью** 20,5 кв. м в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 350/D–213112, помещение на 6-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2	**86,61**	8,66
Сведения о продавце	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76		
Срок подачи заявления	С 04.06.2021 г. по 02.07.2021 г. в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) календарных дня до его проведения		
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта», назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)		
Условия пользования	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств)		
Размер штрафа	Лот № 1–1 (одна) базовая величина, лот № 2 – 2 (две) базовых величины, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующего законодательства)		

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором и предоставить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049. **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **06.07.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/05/spisok-imushhestva-berestovickaya-pmk-141-na-torgi-06.07.21.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, пер. Советский, д. 7.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Берестовицкая ПМК №141», тел. +375 29 3923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, ком. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 5 % от начальной стоимости лота не позднее **05.07.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются **с 9.00 04.06.21 по 17.00 05.07.21** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 22 июня 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 90 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1) Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2) Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 8, 9)** будет выделен согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Затраты за формирование землеустроительного дела, оформления и регистрации земельного участка возмещается за счет победителя аукционных торгов. 3) В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %				
2	Трансформатор ТМ 40/10 (инв. № 925). Трансформатор сварочный ВД-413 (инв. № 2503). **Адрес:** Гомельская обл, г. Добруш, пер. Крылова, 4	**52,00**	2,60	5,20
